*ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ ДЛЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ*

# ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ КРАЯЗНАЎЧЫЯ РЭСУРСЫ

**Раздзел ІІІ. Асобныя калекцыі дакументных рэсурсаў па краязнаўстве**
**Раздзел IV. Бібліяграфічныя рэсурсы бібліятэкі па краязнаўстве**
**1-23 01 11 – Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках)**

Напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (менеджмент)

Спецыялізацыі 1-23 01 11-01 05 Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый

Курс 4

Семестр VII

Лекцыі 12

Практычныя (семінарскія) заняткі 18

Экзамен VII

Аўдыторных гадзін па вучэбнай дысцыпліне 30

Усяго гадзін па вучэбнай дысцыпліне 86

Форма атрымання вышэйшай адукацыі дзённая, завочная

Склалі: І. М. Стрыжонак, А. В. Прадзеіна

Вучэбна-метадычны комплекс складзены на аснове вучэбнай праграмы ―Інфармацыйныя рэсурсы краязнаўства” (17 чэрвеня 2011г., № УД100/баз)

Разгледжан і рэкамендаван да зацвярджэння кафедрай тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый (пратакол № 2 ад 23.09.2015 г.)

Загадчык кафедры

__________В.А. Касап

Мінск
2015

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РАБОЧАЯ ПРАГРАМА

## УСТУП

Студэнты авалодваюць тэрміналогіяй і паняццямі краязнаўства, уласцівасцямі і функцыямі інфармацыйных рэсурсаў па краязнаўстве.

Згодна вучэбнага плана дысцыпліна ―Інфармацыйныя рэсурсы краязнаўства” вывучаецца студэнтамі ФІДК І ФЗН спецыялізацыі ―Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства” як дысцыпліна спецыялізацыі на трэцім, чацвёртым курсах.

Актуальнасць данага курса абумоўлена павышэннем значэння краязнаўчай інфармацыйнай работы, якая на сучасным этапе стала адным з галоўных кірункаў дзейнасці універсальных навуковых, публічных масавых і спецыяльных бібліятэк. Менавіта бібліятэкі працуюць з такімі важнейшымі крыніцамі краязнаўства як тэкставыя дакументы, узрастае значэнне і іншых носьбітаў ведаў і інфармацыі. Курс ―Інфармацыйныя краязнаўчыя рэсурсы” узнік на аснове шэрагу навуковых галін і вучэбных дысцыплін. Гэта перш за ўсё ―Крыніцазнаўства”, ―Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі”, ―Дакументазнаўства”, ―Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства” і інш. Першыя дзве дысцыпліны не вывучаюцца студэнтамі ФІДК. Аднак вялікая ўвага, якая надаецца стварэнню і выкарыстанню краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў у бібліятэках, значнасць праблемы эфектыўнага інфармацыйнага забеспячэння рэгіянальнага развіцця, патрабуюць больш глыбокага ведання будучымі бібліятэкарамі-бібліёграфамі асноўных відаў крыніц дакументна-фіксаванай інфармацыі з рэгіянальным аспектам зместу.

Асноўнай мэтай курса з'яўляецца вывучэнне студэнтамі дакументных рэсурсаў розных форм і відаў – крыніц краязнаўчай інфармацыі. Гэта пераважна друкаваныя і электронныя рэсурсы, з якімі пераважна працуюць на сучасным этапе бібліятэкі. Вывучаюцца дакументы XVI – XXI ст. незалежна ад месца выдання (стварэння), пераважна на беларускай, рускай і польскай мовах, розныя па прыметах знакавай прыроды інфармацыі, перыядычнасці і інш. У адрозненне ад студэнтаў гісторыкаў, географаў і філолагаў, для якіх крыніцы краязнаўства выкладаюцца ў сувязі з галіной будучай прафесіянальнай дзейнасці, для студэнтаў бібліятэкараў-бібліёграфаў важнымі з'яўляюцца ўсе існуючыя галіны краязнаўства, таму змест прапануемай праграмы ахоплівае інфармацыйныя рэсурсы ў розных прадметных абласцях. У параўнанні са студэнтамі іншых спецыяльнасцей, асабліва гісторыкамі, студэнтам бібліятэкарам-бібліёграфам краязнаўцам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

больш важна паглыблена аваладаць бібліяграфічнымі метадамі вывучэння дакументаў і дастаткова мець агульнае ўяўленне аб этапах вывучэння крыніц. Але апошняе таксама неабходна, таму што дапамагае бібліятэкарам-бібліёграфам набываць вопыт ацэнкі інфармацыйнага патэнцыялу дакументаў, іх каштоўнасці.

Студэнты вывучаюць галоўныя дакументныя і бібліяграфічныя рэсурсы, якія з'яўляюцца асновай інфармацыйнага забеспячэння рэгіянальных даследаванняў і папулярызацыі краязнаўчых ведаў, іх функцыянальныя асаблівасці, класіфікацыю і інфармацыйную каштоўнасць.

Беларускія бібліятэкі маюць багатыя краязнаўчыя інфармацыя рэсурсы і прадастаўляюць на іх аснове шырокі асартымент паслуг спажыўцам, актыўна папулярызуюць краязнаўчыя веды. Паглыбленне падрыхтоўкі спецыялістаў у гэтым аспекце будзе спрыяць ўдасканаленню інфармацыйнага забеспячэння краязнаўчага вывучэння рэгіёнаў на карысць захавання іх гістарычна-культурнай адметнасці і паспяховага комплекснага развіцця як суб’ектаў дзяржавы.

Мэтавая накіраванасць дысцыпліны вызначае кола задач, накіраваных на фарміраванне ў студэнтаў адпаведных ведаў і уменняў.

*У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен уяўляць:*

Значэнне інфармацыйных рэсурсаў краязнаўства, іх функцыі і класіфікацыю.

Формы, тыпы і віды крыніц, якія пераважаюць у інфармацыйнай дзейнасці бібліятэк

Асноўныя групы першасных дакументных рэсурсаў, асобныя крыніцы і метады вызначэння іх інфармацыйнай каштоўнасці.

Даведачна-пошукавы апарат дакументных крыніц, іх бібліяграфічнае аснашчэнне.

Краязнаўчыя бібліяграфічныя рэсурсы, іх функцыі, класіфікацыю, структуру, формы, тэхналогію стварэння і выкарыстання.

*Студэнт павінен умець выкарыстоўваць:*

Крыніцазнаўчыя веды па краязнаўству як кампанент прафесіянальнай падрыхтоўкі для бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці па краязнаўстве.

Дакументныя крыніцы розных форм, відаў, часоў стварэння (выдання), на розных мовах для выяўлення краязнаўчай інфармацыі аб рэгіёнах (населеных пунктах), у т.л. тэкставых фрагментаў, фактаграфічных даных, несамастойных бібліяграфічных матэрыялаў.

КДБА, бібліяграфічныя дапаможнікі для бібліяграфічнага пошуку па краязнаўстве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пошукавыя сродкі інтэрнет для выяўлення электронных інфармацыйных рэсурсаў аб рэгіёне (населеным пункце), даступных у онлайнавым рэжыме.

*Студэнт павінен валодаць:*

- ✓ Ведамі па класіфікацыі і тыпалагізацыі дакументных і бібліяграфічных рэсурсаў па краязнаўстве.
- ✓ Ведамі аб групах дакументных рэсурсаў па краязнаўстве, аб найбольш значных крыніцах.
- ✓ Практычнымі ўменнямі выяўлення па дакументных і бібліяграфічных рэсурсах фактаграфічнай і бібліяграфічнай інфармацыі.

*Студэнт павінен мець вопыт:*

Выяўлення дакументных і бібліяграфічных крыніц розных форм, відаў, тыпаў, на розных мовах, створаных у розныя гістарычныя перыяды, прысвечаных асобным рэгіёнам.

Знаходжання краязнаўчай інфармацыі па азначаных параметрах.

Выкарыстання даведачна-пошукавага апарату дакументных крыніц, КДБА, бібліяграфічных дапаможнікаў, у т.л. электронных.

Каштоўнаснай ацэнкі інфармацыйнага патэнцыялу крыніц.

Асноўныя віды заняткаў па дысцыпліне: лекцыі, семінары, практычныя работы. Вывучэнне курса студэнтамі ФІДК і ФЗН завяршаецца экзаменам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Нумар раздзела тэмы | Назва раздзела тэмы | Колькасць аудыторных гадзін | | | | Кіруемая самастойная работа | Іншае | Форма кантроля ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | **Раздзел III. Асобныя калекцыі дакументных рэсурсаў па краязнаўстве** | | | | | | | |
| 1. | Тэма 11. Дакументныя рэсурсы па тапаніміцы рэгіёнаў Беларусі | 2 | 8 | | | 6 | | Гутаркі. |
| 2. | Тэма 12. Дакументныя рэсурсы па геральдыцы і генеалогіі беларускіх рэгіёнаў і населеных пунктаў Беларусі | 2 | 4 | | | 12 | | Праверка пісьмовай працы, гутаркі. |
| 3. | Тэма 13. Дакументныя рэсурсы па дыялектах і гаворках беларускай мовы | 2 | 4 | | | 8 | | Праверка пісьмовай працы, гутаркі, выступленні на семінары. |
| 4. | Тэма 14. Краязнаўчая мемуарыстыка | 2 | | 4 | | 10 | | Праверка пісьмовай працы, гутаркі. |
| 5. | Тэма 16. Краязнаўчыя перыядычныя выданні | 4 | | | | 10 | | Праверка пісьмовай працы, гутаркі, выступленні на семінары. |
| | **Раздзел IV. Бібліяграфічныя рэсурсы бібліятэкі па краязнаўстве** | | | | | | | |
| 6. | Тэма 10. Карткавыя, друкаваныя і электронныя формы бібліяграфічных рэсурсаў па краязнаўстве | | | | | 8 | | Праверка матэрыялаў, гутаркі |
| | Усяго | 12 | 16 | 4 | | 54 | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ КУРСА

### Уводзіны

Мэта, задачы вучэбнай дысцыпліны ―Інфармацыйныя рэсурсы краязнаўства”. Яе значэнне і месца ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне бібліятэчнай справы і бібліяграфіі. Сувязь з іншымі дысцыплінамі агульнавуковага і прафесійнага цыклаў. Забяспечанасць тэарэтычнай, вучэбнай і метадычнай літаратурай.

Структура вучэбнай дысцыпліны. Характарыстыка асноўных раздзелаў, вывучаемых у яе межах. Асноўныя формы аудыторнай і самастойнай работы студэнтаў. Выніковыя і прамежкавыя формы кантролю.

### Раздзел ІІІ. Асобныя калекцыі дакументных рэсурсаў па краязнаўстве

#### Тэма 1. **Афіцыйныя дакументы як крыніцы краязнаўчай інфармацыі**

Значэнне афіцыйных дакументаў як крыніцы краязнаўчай інфармацыі, даставернасць і дакладнасць даных як характэрная іх рыса. Патрэбнасці карыстальнікаў бібліятэк у даных органаў улады і кіраваня, прысвечаных рэгіёнам. Кірункі і формы краязнаўчай дзейнасці бібліятэк па зборы, захаванні і папулярызацыі звестак з афіцыйных дакументаў розных гістарычных перыядаў.

Класіфікацыя асноўных відаў афіцыйных дакументаў перыяду ВКЛ; характарыстыка груп дакументаў, прысвечаных асобным тэрыторыям, населеным пунктам, этнічным групам і асобам. Дакументы рэгіянальных сеймікаў. Методыка пошуку дакументаў, прысвечаных геаграфічным аб’ектам на літоўска-беларускіх землях па ―Volumina legume” і іншых выданнях.

Класіфікацыя афіцыйных дакументаў у перыяд Расійскай імперыі. Методыка пошуку дакументаў, прысвечаных геаграфічным аб’ектам на беларускіх землях, па асноўных выданнях нарматыўна-прававых актаў дарэвалюцыйнага перыяду. Сучасныя выданні заканадаўчых дакументаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Расійскай імперыі аб асобных рэгіёнах Беларусі (“Гродненская губерния в законодательных актах Российской империи” (1801 – 1913) і інш.)

Выданні афіцыйных дакументаў, прысвечаных ваяводствам на тэрыторыі заходнебеларускіх зямель у Польшчы (1921 – 1939 гг.), методыка пошуку фактаграфічных і бібліяграфічных звестак па іх.

Выданні афіцыйных дакументаў перыяду БССР, прысвечаныя адміністрацыйна-тэрытарыяльным адзінкам і іншым геаграфічным аб’ектам,[1] методыка пошуку фактаграфічных і бібліяграфічных звестак па іх.

Выяўленне афіцыйных дакументаў розных гістарычных перыядаў у выданнях сучаснай навуковай літаратуры, у часопісах і інш.

Тэма 2. **Дакументныя рэсурсы справаводства як крыніцы краязнаўчай інфармацыі**

Патрэбнасці карыстальнікаў бібліятэк у дадзеных справаводства і статыстыкі, прысвечаных рэгіёнам. Кірункі і формы краязнаўчай дзейнасці бібліятэк па зборы, захаванні і папулярызацыі дакументаваных матэрыялаў справаводства і статыстыкі.

Відавая класіфікацыя матэрыялаў справаводства перыяду ВКЛ. Лісты, прывілеі, падцвяржэнні, прызнанні, справы, інвентары і іншыя дакумены ў перыяд ВКЛ; іх структура, асаблівасці афармлення. Дакументацыя магістратаў, гродскіх і земскіх судоў, паняцце “актавыя кнігі”. Адлюстраванне матэрыялаў справаводства ў выданнях “Літоўскай метрыкі”, буйнейшых зборніках актавых дакументаў ХІХ – пачатку ХХІ стст. Недахопы выданняў дакументаў мясцовых судовых і адміністрацыйных органаў ВКЛ, здзейсненых у ХІХ – ХХ ст. Павышэнне навуковага і бібліяграфічнага ўзроўня сучасных выданняў матэрыялаў рэгіянальнага справаводства: пачатак выпуска серыі “Беларусь у актавых кнігах XVI – XVIII стст.” (“Магілёўскі магістрат, 1580 – 1581, 1588.”і інш.).

[1] Па сучаснаму перыяду вывучаецца ў курсе “Інфармацыйныя рэсурсы сацыяльна-гуманітарнага комплексу”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Методыка пошуку фактаграфічных і бібліяграфічных звестак аб гістарычных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках і населеных пунктах па выданнях справаводных дакументаў.

Матэрыялы справаводства дзяржаўных устаноў Расійскай імперыі як крыніца краязнаўчай інфармацыі. Класіфікацыя матэрыялаў справаводства (пратаколы, справаздачы, перапіска і інш.). Справаздачы губернатараў. Матэрыялы судова-следчых устаноў. Каштоўнасць судовых матэрыялаў для вывучэння нацыянальна-вызваленчага руху ў рэгіёнах Беларусі, іх эканамічнага развіцця і выяўлення звестак аб асобах.

Увядзенне статыстычнага ўліку у беларускіх губернях. Статыстычныя матэрыялы ў “Обзорах губерний”, “Памятных книжках …губернии”. Асноўныя статыстычныя выданні. Развіццё дэмаграфічнай статыстыкі, гарадскія перапісы. Звесткі аб беларускіх губернях у выданні матэрыялаў першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі (1897 г.)

Крыніцы статыстыкі насельніцтва Заходняй Беларусі (1921 – 1939 гг.).

Дзейнасць рэгіянальных статыстычных упраўленняў на сучасным этапе па выпуску рэгіянальных статыстычных даведнікаў, асаблівасці іх зместу і структуры. Статыстычная інфармацыя на афіцыйных сайтах выканкамаў у інтэрнет.

### Тэма 3. **Дакументныя рэсурсы па генеалогіі насельніцтва беларускіх рэгіёнаў**

Патрэбнасці карыстальнікаў бібліятэк у біяграфічнай і радаводнай інфармацыі. Кірункі і формы дзейнасці бібліятэк па зборы, захаванні і папулярызацыі дакументаваных генеалагічных ведаў аб рэгіянальнай супольнасці. Прамыя і ўскосныя генеалагічныя звесткі як асноўныя паняцці для пошукавых дзеянняў бібліёграфа і крытэрыі выбару крыніц.

Характарыстыка крыніц генеалогіі. Асноўныя віды друкаваных крыніц генеалогіі; адрозненні паміж імі ў залежнасці ад паўнаты адлюстравання радаводаў. Гербоўнікі шляхты як асноўныя крыніцы радаводаў шляхты, значэнне латэнтнай бібліяграфічнай інфармацыі ў іх. Методыка выяўлення

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

радаводаў шляхты асобных беларускіх рэгіёнаў па гербоўніках XVI – сярэдзіны XX ст. Навукова-метадалагічны ўзровень сучасных беларускіх рэгіянальных гербоўнікаў.

Даведачныя выданні з персанальным аспектам зместу (гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі –Памяць”, гістарычныя хронікі; дарэвалюцыйныя даведнікі).

Навуковая біяграфічная літаратура (гісторыка-генеалагічныя біяграфіі, персанаграфічныя публікацыі ў выданнях матэрыялаў навуковых канферэнцый, у краязнаўчых часопісах і інш.) Навукова-папулярная біяграфічная літаратура. Персанаграфічныя матэрыялы на старонках мясцовага і цэнтральнага перыядычнага друку. Мясцовыя радаводы і біяграфіі ў краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі. Рэгіянальны аспект прадстаўлення інфармацыі аб беларускіх родах у інтэрнет.

### Тэма 4. **Дакументныя рэсурсы па геральдыцы беларускіх рэгіёнаў і населеных пунктаў**

Значэнне геральдычнай інфармацыі ў краязнаўчай дзейнасці бібліятэк. Кірункі і формы дзейнасці бібліятэк па зборы, захаванні і папулярызацыі дакументаваных ведаў аб рэгіянальнай геральдыцы.

Характарыстыка крыніц геральдыкі. Асноўныя віды друкаваных крыніц геральдыкі. Методыка пошуку геральдычных сімвалаў адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, населеных пунктаў, карпарацыйных і індывідуальных суб’ектаў на тэрыторыі Беларусі па гербоўніках розных гістарычных перыядаў. Сучасныя крыніцы рэгіянальнай геральдычнай інфармацыі (друкаваныя і электронныя). Мясцовая геральдыка ў краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі.

### Тэма 5. **Дакументныя рэсурсы па тапаніміцы рэгіёнаў Беларусі**

Патрэбнасці карыстальнікаў бібліятэк у тапанімічнай інфармацыі. Кірункі і формы дзейнасці бібліятэк па зборы, захаванні і папулярызацыі дакументаваных ведаў па рэгіянальнай тапаніміцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Класіфікацыя дакументальных крыніц па тапаніміцы беларускіх рэгіёнаў і іх характарыстыка. ―Слоўнікі назваў населеных пунктаў” Я.Н.Рапановіча; нарматыўныя даведнікі Інстытута мовазнаўства імя Я.Коласа НАН Беларусі. Тапанімічная інфармацыя ў іншых даведачных выданнях розных гістарычных перыядаў; электронныя рэсурсы. Навуковая і навукова-папулярная літаратура па тапаніміцы. Буйнейшыя бібліяграфічныя крыніцы па тапаніміцы.

### Тэма 6. **Дакументныя рэсурсы па дыялектах і гаворках беларускай мовы**

Значэнне інфармацыі аб асаблівасцях маўлення мясцовага насельніцтва ў краязнаўчай рабоце бібліятэк. Кірункі і формы дзейнасці бібліятэк па зборы, захаванні і папулярызацыі дакументаваных ведаў аб дыялектах і гаворках беларускай мовы. Удзел бібліятэк у зборы моўнага матэрыялу ў рэгіёне.

Характарыстыка крыніц па дыялектах і гаворках беларускай мовы. Класіфікацыя дыялектных слоўнікаў. Рэгіянальныя слоўнікі беларускай мовы (―Віцебскі краёвы слоўнік”, ―Краёвы слоўнік Усходняй Магілёўшчыны”, ―Тураўскі слоўнік”, ―Дыялектны слоўнік Брэстчыны” і інш.). Навуковая і вучэбная літаратура па дыялектах і гаворках беларускай мовы. Бібліяграфічнае аснашчэнне рэгіянальных моўных слоўнікаў і іншых крыніц; асноўныя бібліяграфічныя дапаможнікі для пошуку дакументаў аб рэгіянальных асаблівасцях беларускай мовы.

### Тэма 7. **Фотадакументы як крыніцы краязнаўчай інфармацыі**

Значэнне фотадакументаў у краязнаўчай дзейнасці бібліятэк. Паняцце ―краязнаўчая фатаграфія”. Кірункі і формы дзейнасці бібліятэк па зборы, захаванні і папулярызацыі краязнаўчай фатаграфіі. Стварэнне ў бібліятэках фондаў краязнаўчых фатаграфій і фондаў выданняў з фотаматэрыяламі аб краі. Характарыстыка асноўных груп выданняў, якія змяшчаюць фатаграфіі: фотаальбомаў, даведачных і навуковых і навукова-папулярных выданняў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мясцовага перыядычнага друку. Краязнаўчая фатаграфія ў выданнях знакамітых фатографаў і фотазбіральнікаў (Я.Балзункевіча, Я.Булгака, Р.Афтаназі, М.Раманюка, В.Федарука і інш.) Асноўныя этапы і працэсы вывучэння фотадакументаў бібліятэкарам-бібліёграфам. Краязнаўчая фатаграфія ў бібліяграфічнай прадукцыі. Выкарыстанне фотадакументаў у формах масавай работы і інш.

Фатаграфіі на краязнаўчых і рэгіянальных беларускіх сайтах у інтэрнет.

### Тэма 8. **Краязнаўчая інфармацыя ў мемуарнай літаратуры**

Характарыстыка мемуараў як краязнаўчай крыніцы; іх класіфікацыя. Значэнне мемуараў у краязнаўчай дзейнасці бібліятэк. Вусныя ўспаміны, наданне ім дакументаванай формы ў бібліятэках.

Асаблівасці мемуарнай літаратуры асобных гістарычных перыядаў, асноўныя віды мемуараў на кожным з іх, аўтарскі склад мемуарыстаў. Характарыстыка лепшых мемуараў рэгіянальнага зместу ў асобныя гістарычныя перыяды. Рэгіянальныя аспекты мемуараў беларускіх эмігрантаў. Бібліяграфічнае аснашчэнне мемуарнай літаратуры. Бібліяграфічныя крыніцы па мемуарыстыцы.

### Тэма 9. **Краязнаўчая інфармацыя ў перыядычных выданнях і выданнях з працягам**

Выкарыстанне перыядычнага друку як крыніцы краязнаўчай інфармацыі. Краязнаўчыя перыядычныя выданні і краязнаўчая інфармацыя ў мясцовым друку.

Перыядычныя выданні і выданні з працягам дарэвалюцыйнага перыяду са значным аб’ёмам краязнаўчай інфармацыі: “Месячнік Полацкі”, “Рубон”, “Атэнэум”, “Кур’ер літоўскі”, “Тыгоднік ілюстраваны” і інш. Афіцыйны друк: “губернскія” і “епархіальныя ведамасці”. Краязнаўчая інфармацыя ў нацыянальных выданнях пачатку XX ст.: газета “Наша ніва”. Краязнаўчая бібліяграфічная інфармацыя і бібліяграфічныя матэрыялы аб мясцовым друку ў перыёдыцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Раённыя і абласныя выданні ў БССР. Часопіс “Наш край”. Краязнаўчая інфармацыя ў мясцовым і нацыянальным друку ў Заходняй Беларусі (1921 – 1939 гг.), краязнаўчыя часопісы “Атэнэум віленьскі” і мясцовых аддзяленняў Польскага краязнаўчага таварыства. Краязнаўчыя бібліяграфічныя матэрыялы ў перыёдыцы міжваеннага часу.

Краязнаўчыя матэрыялы ў сучасных беларусазнаўчых перыядычных выданнях, выданнях з працягам: “Помнікі гісторыі культуры Беларусі”, “Спадчына”, “Беларуская мінуўшчына”, “Беларускі гістарычны часопіс”, “Падарожнік”, “Беларускі гістарычны агляд”, “Беларусіка=Albaruthenika” і інш.

Мясцовы друк у Рэспубліцы Беларусь. Шырокае распаўсюджанне рэгіянальных краязнаўчых перыядычных выданняў. Краязнаўчыя часопісы, альманахі, неперыядычныя зборнікі, газеты: “Берасцейскія карані”, “Гарадзенскія запісы”, “Віцебскі сшытак”, “Куфэрак Віленшчыны”, “Магілёўская даўніна”, “Магілёўшчына”, “Лідскі летапісец”, ”Павет”, “Палессе”, “Сьвіцязь”, “Краязнаўчая газета” і інш. Краязнаўчыя бібліяграфічныя матэрыялы ў сучаснай перыёдыцы.

## Раздзел IV. Бібліяграфічныя рэсурсы бібліятэкі па краязнаўстве

### Тэма 10. Карткавыя, друкаваныя і электронныя формы бібліяграфічных рэсурсаў па краязнаўстве

Краязнаўчыя каталогі і картатэкі, базы даных, бібліяграфічныя дапаможнікі: іх азначэнне, функцыянальныя і метадычныя асаблівасці, камунікацыйны патэнцыял як сродка трансляцыі назапашаных рэгіянальнай супольнасцю дакументаваных гісторыка-культурных каштоўнасцей, як крыніцы інфармацыйнага забеспячэння сучаснага ўстойлівага развіцця рэгіёнаў. Значэнне зводных краязнаўчых каталогаў. Бібліяграфічныя і фактаграфічныя краязнаўчыя картатэкі: віды, тэматыка. Краязнаўчыя базы даных: бібліяграфічныя, фактаграфічныя і паўнатэкставыя: фарматы, структура, прадстаўленне ў лакальных сетках і інтэрнэт. Відавы, тыпалагічны і жанравы склад краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Значэнне каталогаў мясцовых дакументаў для мэт інфармацыйнага забеспячэння па краязнаўстве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## МЕТАДЫЧНЫЯ ЎКАЗАННІ ДЛЯ СЕМІНАРАЎ

Семінарскія заняткі з'яўляюцца вынікам самастойнай работы па вывучэнні асноўнай і дадатковай літаратуры па прапанаваных ніжэй тэмах семінарскіх заняткаў. Семінарскія заняткі садзейнічаюць больш глыбокаму асэнсаванню і засваенню самых складаных і значных тэм курса.

На семінары студэнты павінны паказаць дастаткова глыбокае веданне матэрыялу тэмы, уменні аналізаваць гэты матэрыял, самастойна разважаць і рабіць тэарэтычныя і практычныя вывады па вызначанай тэме.

У падрыхтоўку да семінарскага занятку ўваходзіць вывучэнне рэкамендуемай літаратуры, канспектаванне, складанне разгорнутых адказаў па кожным пытанні. Неабходна прачытаць асноўную і дадатковую літаратуру, зрабіць выпіскі і падрыхтаваць кароткі або разгорнуты (па жаданні студэнта) пісьмовы адказ на кожнае пытанне семінара. Гэтымі запісамі студэнт можа карыстацца пры адказах на семінарскіх занятках.

Існуюць наступныя патрабаванні да выступлення студэнта: добрае валоданне вывучаным матэрыялам; уменне звязаць яго з адпаведным напрамкам дзейнасці бібліятэк; лагічнасць і паслядоўнасць у адказе; выдзяленне найбольш важных палажэнняў і ўменне зрабіць вывады па кожным пытанні семінара. Дадатковыя балы набіраюць студэнты, якія дапаўняюць выступленні, выказваюць крытычныя і ацэначныя меркаванні, вядуць дыскусію, рыхтуюць невялікія прэзентацыі па тэматыцы семінараў.

### СЕМІНАР
### Афіцыйныя дакументы як крыніцы краязнаўчай інфармацыі аб рэгіёнах Беларусі, 2 гадзіны

*Пытанні для абмеркавання*

1. Якая сістэма рэгіянальнага кіравання склалася ў ВКЛ? Якія асноўныя віды афіцыйных дакументаў атрымалі распаўсюджанне? *(1, 2, 3 – асноўная літ; 1, 2 – дадатковая літ., матэрыялы практычнай работы)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Якія асноўныя публікацыі афіцыйных дакументаў ВКЛ? Ахарактэрызуйце методыку пошуку краязнаўчай інфармацыі па іх. *(1, 2, 4 – асноўная літ; матэрыялы практычнай работы)*
3. Якія асноўныя віды афіцыйных дакументаў перыяду Расійскай імперыі? *(1, 2 – асноўная літ; матэрыялы практычнай работы)*
4. Якія асноўныя публікацыі афіцыйных дакументаў Расійскай імперыі? Ахарактэрызуйце методыку пошуку краязнаўчай інфармацыі па іх. *(матэрыялы практычнай работы)*
5. Якія асноўныя віды афіцыйных дакументаў Другой Рэчы Паспалітай Польскай і іх асноўныя выданні? Ахарактэрызуйце методыку пошуку нарматыўных дакументаў аб беларускіх ваяводствах. *(канспект лекцый, матэрыялы практычнай работы)*

**Літаратура**

**Асноўная**


1. *Ходзін, С.М.* Крыніцы гісторыі Беларусі / *С.М Ходзін.* – Мн., 1999. – С.22 – 36.
2. *Дакументы* заканадаўства як крыніца па гісторыі Беларусі // Старонкі гісторыі і культуры Беларусі / Пад рэд. А.Г.Каханоўскага. – Мн.: ТАА ―Красіка-прынт", 1997.–103с.
3. *Місарэвіч, Н.В.* Прывілей як крыніца беларускага феадальнага права / Н.В.Місарэвіч // Весн. Гродзен. дзярж. ун-та імя Я.Купалы. Сер. 1, Гуманітар. навукі. – 2002. – № 1. – С.109 – 114.
4. Саітава, В.І. Крыніцы бібліяграфічнай інфармацыі перыяду Рэчы Паспалітай абодвух народаў аб краях Беларусі / В.І.Саітава // Матэрыялы Другіх Кнігазнаўчых чытанняў ―Кніжная культура Рэчы Паспалітай" (Мінск, 15 – 16 верасня 2000 г.). – Мн., 2002. – С.8 – 31.


**Дадатковая**


1. *Груша, А.І.* Інфармацыйныя элементы фармуляра дакумента канцэлярыі Вялікага княства Літоўскага 40-х гадоў XV – першай


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паловы XVI ст. / А.І.Груша // Бел. археагр. штогоднік. – Мн., 2001. – С.205 – 214.

2. *Груша, А.І.* Канцэлярыя ВКЛ 40-х гадоў XV – першай паловы XVI ст. / А.І.Груша // Бел. гіст. часоп. – Мн., 2002. – № 2/3 – С.21 – 27.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СЕМІНАР**

**Матэрыялы справаводства і статыстыкі як крыніцы краязнаўчай інфармацыі,**

**4 гадзіны**

*Пытанні для абмеркавання*

1. У чым заключаецца значэнне матэрыялаў справаводства і статыстыкі ў краязнаўчых даследаваннях? Якая іх класіфікацыя? *(2 – дадатковая літ.)*

2. Якія матэрыялы справаводства рыхтаваліся ў адміністрацыйных органах ВКЛ? Ахарактэрызуйце асноўныя публікацыі гэтых матэрыялаў у розныя гістарычныя перыяды. *(2 – асноўная літ.; 1, 2 – дадатковая літ.)*

2.1. Прачытайце артыкул В.С. Мянжынскага *(№ 3 спіса асноўнай літ.)* і адкажыце на пытанне: чым ўзбагацілі веды аб мінулым рэгіёнаў уключаныя ў кнігі ―Памяць" тэксты матэрыялаў справаводства?

3. Прачытайце артыкул: Шумейко, М.Ф. *(№ 6 спіса асноўнай літ.)* Адкажыце на пытанне: якія недахопы былі ў выданнях архіўных дакументаў дарэвалюцыйнага часу?

4. Якія матэрыялы рыхтаваліся губернскімі праўленням і губернскімі статыстычнымі камітэтамі ў XIX – пачатку XX стст.? *(матэрыялы практычнай работы)*

4.1. Якія матэрыялы змяшчаліся ў ―Намятных кніжках губерняў"? *(матэрыялы практычнай работы)*

4.2. На падставе матэрыялаў *практычнай работы* адкажыце на пытанне: ці падзяляеце Вы меркаванне аб тым, што губстаткамітэты былі цэнтрамі краязнаўчай работы?

5. Як вялася (вядзецца) дзейнасць архіўных устаноў і археаграфічных арганізацый па публікацыі актавых дакументаў у БССР і Рэспубліцы Беларусь? *(4, 5 – асноўная літ.)*

5.1. На падставе выдання *№ 1* асноўнай літаратуры выявіце змяненні ідэйных і змястоўных прыярытэтаў ў выданнях зборнікаў актавых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дакументаў, прысвечаных Віцебшчыне, на працягу асобных гістарычных перыядаў.

6. Як вядзецца публікацыя статыстычных матэрыялаў у Рэспубліцы Беларусь? Ахарактэрызуйце віды статыстычных даведнікаў з рэгіянальным аспектам зместу. *(матэрыялы практычнай работы)*

## Літаратура

### Асноўная


1. Витебщина архивная в начале XXI века: связь времен. – Витебск: Витеб. обл. типография, 2008. – 191 с.
2. Рыбакоў, А. Арганізацыя справаводства ў Вялікім княстве Літоўскім у канцы XV – XVII стст. / А.Рыбакоў // М.М.Улашчык і праблемы беларускай гістарыяграфіі, крыніцазнаўства і археаграфіі (да 90-х угодкаў вучонага): матэрыялы навук. канф. / БелНДІДАС; БДУ. Гіст. фак; Рэд.-склад. А.М.Гесь, В.У.Скалабан. – Мн., 1997. – С.237 – 249.
3. Мянжынскі, В.С. Матэрыялы з Метрыкі Вялікага княства Літоўскага, апублікаваныя М.Ф.Спірыдонавым у серыі ―Памяць" – гісторыка-дакументальных хронік гарадоў і раёнаў Беларусі / В.С.Мянжынскі // Памяць стагоддзяў на карце Айчыны: зборнік навуковых парц у гонар 70-годдзя М.Ф.Спірыдонава. – Мінск, 2007. – С.389 – 396.
4. Седляревич, Т. Роль системы научно-справочного аппарата госархивов в обеспечении доступа к информационным ресурсам / Т. Седляревич // Архівы і справаводства. – 2002. - № 6. – С.85 – 89.
5. Шумейко, М.Ф. К 70-летию образования областных государственных архивов / М.Ф.Шумейко // Архівы і справаводства. – 2008. - № 3. – С.138 – 140.
6. Шумейко, М.Ф. Состояние и развитие археографии в Беларуси во второй половине XIX – начале XX в. / М.Ф.Шумейко // Бел. археограф. штогоднік. – 2001. – Вып.2. – С.41 – 64.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Дадатковая**

1. Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кн. 43 (1523 – 1560). – Мн. : Бел. навука, 2003. – 167 с. (Чытаць уводзіны, праглядзець навукова-даведачны апарат выдання, вызначыць функцыі і метадычныя асаблівасці асобных яго кампанентаў. Звярнуць увагу на структуру імяннога, геаграфічнага і прадметнага паказальнікаў).
2. Несцяровіч, Ю.У. Праблема класіфікацыі археаграфічных публікацый і беларускія археаграфічныя выданні: (гісторыка-археаграфічны нарыс) / Ю.У.Несцяровіч. – Мн.: БелНДІДАС, 1997. – 56 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СЕМІНАР**
**Інфармацыйныя рэсурсы па генеалогіі беларускіх рэгіёнаў,**

**2 гадзіны**

*Пытанні для абмеркавання*

1. Якое значэнне генеалогіі ў краязнаўчай дзейнасці бібліятэк? *(2 – асноўная літ.)*
2. Што адносіцца да неапублікаваных крыніц генеалогіі? *(1, 3-5 – асноўная літ.; 1 – дадатковая літ.)*
3. Якія асноўныя віды друкаваных дакументаў па генеалогіі? *(1, 4 – асноўная літ.)*
4. Чаму гербоўнікі з'яўляюцца асноўнымі выданнямі для выяўлення радаводаў шляхецка-дваранскага саслоўя?

*4.1* . якая методыка выяўлення радаводаў шляхты асобных беларускіх рэгіёнаў па гербоўніках XVI – сярэдзіны XX ст.? *(матэрыялы практычнай работы)*

*4.2* . ахарактарызуйце навуковы і даведачна-пошуку патэнцыял сучсных рэгіянальных гербоўнікаў беларускай шляхты? *(матэрыялы практычнай работы)*

5. На падставе артыкула В. Насевіча *(№ 6 спіса асноўнай літ.)* раскрыйце значэнне праграмы —Радавод" для стварэння электроннага рэсурса па сямейнай гісторыі ў рэгіянальным аспекце.
6. У чым значэнне і асаблівасці дарэвалюцыйных даведачных выданняў аб насельніцтве беларускіх рэгіёнаў ? *(матэрыялы практычнай работы)*
7. Якія групы выданняў аб насельніцтве рэгіёнаў існуюць у складзе навуковай і навукова-папулярнай біяграфічнай літаратуры? *(матэрыялы практычнай работы)*

*Літаратура*

*Асноўная*

1. Баранава, Ю.А. Генеалогія беларускага шляхецка-дваранскага саслоўя: гістарыяграфічны агляд / Ю.А.Баранава // Труды молодых специалистов

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Полоцкого государственного университета. – Полоцк, 2007. – Вып. 20. Гуманитарные науки. – С.77 – 83.
2. Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк: метад. рэкамендацыі. – Мінск, 1994. – С.60 – 61.
3. Малы гербоўнік Наваградскай шляхты. – Мн.: БелНДІДАС, 1997. – 239 с. Прадмова.
4. Рыбчонак, С.А. Класіфікацыя крыніц па генеалогіі / С.А.Рыбчонак // Гістарычныя крыніцы. – Мн., 2001.– С.43 – 45.
5. Яцкевіч, З. Малы гербоўнік халопеніцкай шляхты / З.Яцкевіч – Мн.: Бел. кнігазбор, 1999. – 494 с. Прадмова.
6. Носевич, В. Программа «Родовод»: итоги и перспективы / В.Носевич // М.Улашчык і праблемы беларускай гістарыяграфіі, крыніцазнаўства і археаграфіі (да 90-х угодкаў вучонага): матэрыялы навуковай канф., Мінск, 14 – 15 лютага 1996 г.). – Мінск, 1997. – С. 250 – 256.

*Дадатковая*

1. Гербоўнік беларускай шляхты. Т.1. / Т.Капіца, А.Леўчык, С.Рыбчонак і інш; Нац. Цэнтр па архівах і справаводству Рэсп. Беларусь. – Мн., 2002. – 493 с. Прадмова.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СЕМІНАР
## Інфармацыйныя рэсурсы па геральдыцы беларускіх рэгіёнаў, 2 гадзіны

*Пытанні для абмеркавання*

1. Якое значэнне геральдыкі ў краязнаўчай дзейнасці бібліятэк? *(канспект лекцый, 1,4,6 – дадатковая літ.)*
2. Якія віды гербоў даследуюцца краязнаўцамі? *(1,2, 4 – асноўная літ.)*
3. Чым адрозніваюцца гербы беларускіх населеных пунктаў і рэгёнаў у розныя гістарычныя перыяды:
   a. у ВКЛ? *(№4-6 – асноўная літ.)*
   b. у Расійскай імперыі? *(№4-6 – асноўная літ.)*
   c. у Рэспубліцы Беларусь? *(№ 4-6 – асноўная літ.)*
4. Якая класіфікацыя друкаваных крыніц геральдыкі? *(матэрыялы практычнай работы)*
5. Як прадстаўлены гербы беларускіх населеных пунктаў, адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак і родаў у гербоўніках Б.Папроцкага, С.Акольскага, К.Нясецкага, А.В.Каяловіча, Ю.Ябланоўскага і інш. *(4-6 – асноўная літ.; 2 – дадатковая літ.)*
6. Як прадстаўлены гербы беларускіх населеных пунктаў, адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак і прыватных асобаў у гербоўніках XIX – пачатку XX ст.( «Общий гербовник дворянских родов», «Российская родословная книга», гербоўнікі А.Банецкага, Д.Даўгялы. *(4-6 – асноўная літ.; 2 – дадатковая літ.)*
7. Хто ў Рэспубліцы Беларусь адносіцца да вядомых даследчыкаў рэгіянальнай геральдыкі? Дзе вядзецца рэгістрацыя новых гербоў? *(№1-3 дадатковая літ.)*
8. Як прадстаўлены гербы ў рэгіянальных гербоўніках беларускай шляхты, падрыхтаваных на сучасным этапе? *(1, 7 – асноўная літ.)*
9. Як прадстаўлены гербы адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак і населеных пунктаў ў сучасных геральдычных даведніках? *(3 – асноўная літ.)*

*Літаратура*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Асноўная*


1. Малы гербоўнік Наваградскай шляхты. – Мн.: БелНДІДАС, 1997. – 239 с. Прадмова.
2. Рассадин, С. ―Галантный век" городской геральдыки Беларуси /С. Рассадин // Архівы і справаводства. – 2001. – № 1 – 5.
3. Рассадзін, С.Я. Гербы і сцягі гарадоў і раёнаў Беларусі \ С.Я.Рассадзін, А.М.Міхальчанка. – Мн.: Беларусь, 2005. – 128 с. Прадмова.
4. Цітоў А.К. Геральдыка беларускіх местаў (XVI – пачатак XX ст.) /А.К.Цітоў. – Мн.: Полымя, 1998. – 286 с.: іл. – Геагр. паказ.: С.282 – 283. – Бібліягр.: С. 284 – 285.
5. Цітоў А.К. Гарадская геральдыка Беларусі / А.К Цітоў. – Мн.: Полымя, 1988. – 207 с.: іл.
6. Цітоў А.К. Сфрагістыка і геральдыка Беларусі: (Ілюстр. курс лекцый) / А.К.Цітоў. – Мн., 1999. – 176 с.
7. Яцкевіч, З. Малы гербоўнік халопеніцкай шляхты / З.Яцкевіч – Мн.: Бел. кнігазбор, 1999. – 494 с. Прадмова.


*Дадатковая*


1. Адамович, Т. На Гомельщине возрождают историческую память // Т.Адамович //Архівы і справаводства. – 2001. - № 6 – С.104 – 108.
2. Гербоўнік беларускай шляхты. Т.1. / Т.Капіца, А.Леўчык, С.Рыбчонак і інш; Нац. Цэнтр па архівах і справаводству Рэсп. Беларусь. – Мн., 2002. – 493 с. Прадмова.
3. Елинская, М. Основные художественно-геральдические направления в развитии современной официальной символики Беларуси / М.Елинская // Архівы і справаводства. – 2008. – № 6. – С.114 – 119.
4. Цітоў, А. Геральдыка Беларусі (ад пачаткаў – да канца XX стагоддзя) / А.Цітоў. – Мінск: Мінская фабрыка каляровага друку, 2007. – 128 с.
5. Чаропка, В. Сімвалы роднага краю / В. Чаропка // Бел. мінуўшчына. – 1997. – № 5. – С.58-62.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Шпунт, А. Гарадскія гербы Беларусі з прыкметамі гербаў рэлігійнай групы /Андрэй Шпунт // Наша вера. – 2002. – № 2. – С.68 – 71; № 3. – С.74 – 77.
7. Ліпскі, У.С. Я: Праўдзівы аповяд пра твой і мой радавод / У.С.Ліпскі – Мн.: Беларусь, 1998. – 318 с.

*Заданне для НДР*

1. Выявіць літаратуру і падрыхтаваць рэферат па тэме ―Герб....(горада ці інш.).
2. Падрыхтаваць паведамленне ―Інфармацыйныя рэсурсы....бібліятэкі па геральдыцы”

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СЕМІНАР

## Інфармацыйныя рэсурсы па рэгіянальнай тапаніміцы, 2 гадзіны

*Пытанні для абмеркавання*

*1.* Што такое “анамастыкі” і “тапаніміка”, іх задачы; значэнне, класіфікацыя, арганізацыя даследаванняў на сучасным этапе. *(5 асноўная літ.; 1, 6 - дадатковая літ.)*

*2.* Якое значэнне тапанімікі ў краязнаўчай дзейнасці бібліятэк? *(6 – дадатковая літ.; канспект лекцый)*

3. Чым вызначаюцца асноўныя групы дакументальных крыніц, якія змяшчаюць тапанімічную інфармацыю?

   a. Слоўнікі і нарматыўныя даведнікі назваў населеных пунктаў, унутрыгарадскіх аб’ектаў. *(1, 4 – асноўная літ.)*
   b. Іншыя сучасныя даведачныя выданні, прысвечаныя рэгіёнам і населеным пунктам, кнігі “Памяць”. *(матэрыялы практычнай работы)*
   c. Звесткі аб рэгіянальных тапонімах у даведачных дарэвалюцыйных выданнях. *(матэрыялы практычнай работы)*
   d. Як адлюстраваны ў даведачных выданнях тыпы населеных пунктаў, дадзеныя аб зменах назваў? *(1, 2, 4 – асноўная літ.; матэрыялы практычнай работы)*
   e. Навуковыя і навукова-папулярныя выданні. *(3-4 – дадатковая літ.; матэрыялы практычнай работы)*
   f. Матэрыялы ў перыядычным друку. *(2 – дадатковая літ; матэрыялы практычнай работы)*

### Літаратура

### Асноўная

1. Гапоненка, І.А. Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: … вобласць: нармат. давед. / пад агул. рэд. Лемцюговай В.П. – Мінск : Тэхналогія, 2003. – 2008.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя / Нац. акад. навук Беларусі, ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, Выд. “Бел. энцыкл.” імя П.Броўкі. – Мн.: БелЭн, 2004 – (прадмовы).

3. Мезенка, Г.М. Назвы вуліц расказваюць / Г.М.Мезенка; Віцеб дзярж. ун-т. – Віцебск, 1995. – 84 с.

4. Рапановіч Я. Слоўнік назваў населеных пунктаў... вобласці. – Мн., 1975 – 1984.

5. Шур, В. З гісторыі ўласных імёнаў / В.Шур. – Мн.: Вышэйш. шк. – 1993 – 156 с. (прадмова і с.90 – 136).

**Дадатковая**

1. Жучкевич, В.А. Краткий топонимический словарь Белоруссии / В.А.Жучкевич. – Мн., 1974. – 448 с., прадмова.

2. Ісаенка, У. Слаўны ў вяках Акмэн-Мен-Менск-Мінск / Уладзімір Ісаенка // Маладосць. – 2004 – № 10. – С.120 – 124.

3. Канапацкая, З.І. Фарміраванне татарскіх паселішчаў у Вялікім княстве Літоўскім (XVI – XVII стст.) / З.І.Канапацкая // Весці БДПУ. Серыя 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2005. – № 1. – С.29 – 32.

4. Князева, В.М. Падарожжа па Беларусі: гарады і гарадскія пасёлкі / В.М.Князева. – Мн.: Беларусь, 2005. – 300 с.

5. Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк: метад. рэкамендацыі. – Мінск, 1994. – С.60 – 61.

6. Рогалев, А.Ф. Этнотопонимия Беларуси (на фоне этнической истории) – Гомель, 1993. – 167 с.

*Заданні для НДР*

*Падрыхтаваць даклады:*

1. Паходжанне назваў вобласці (раёна, горада).
2. Паходжанне рэгіянальных (раёна і інш.) гідронімаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СЕМІНАР

**Фотадакументы як крыніцы краязнаўчай інфармацыі, 2 гадзіны**

*Пытанні для абмеркавання*

1. Чым характарызуецца краязнаўчая фатаграфія як кірунак фотамастацтва?
2. Хто належыць да выдатных фотамайстроў-краязнаўцаў?
3. Хто належыць да выдатных збіральнікаў краязнаўчых фотаздымкаў?
4. Якія жанры краязнаўчай фатаграфіі?
5. Якая відавая класіфікацыя фотадакументаў? Ахарактарызуйце асаблівасці выданняў:
    a. Фотальбомаў.
    b. Паштовак, календароў.
    c. Выданняў розных відаў, у якіх фатаграфія з'яўляецца ілюстрацыйным матэрыялам (кнігі, перыядычныя выданні і інш.)
6. Як выкарыстоўваюцца фотадакументы ў краязнаўчай дзейнасці бібліятэк?
    a. Выяўленне і адбор краязнаўчых фатаграфій.
    b. Асноўныя этапы і працэсы вывучэння фотадакументаў бібліятэкарам-бібліёграфам краязнаўцам.
    c. Кірункі выкарыстання фотадакументаў.
7. Якія значныя краязнаўчыя фотакалекцыі беларускіх рэгіёнаў у інтэрнет?

*Заданні для НДР*

*Падрыхтаваць даклады:*

1. Рэгіён (горад, раён, вобласць) у фотавыданнях. (Можна вызначыць храналагічны перыяд).
2. Сучасны выдатны фотамастак-краязнавец (персона ўзгадняецца з выкладчыкам)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Літаратура**

**Асноўная**

1. Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк: метад. рэкамендацыі / НББ; склад. Р.М.Чыгірова, М.У.Сокал. – Мн., 1994. – С.60 – 61.
2. Грыневіч, А. Беларускаму дзяржаўнаму архіву кінафотафонадакументаў – 60 гадоў / А.Грыневіч // Архівы і справодства. – 2001. – № 2. – С.76 – 80.
3. Саітава, В.І. Фотадакументы як аб'ект краязнаўчай дзейнасці бібліятэк / В.І.Саітава // XI Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 24 – 26 мая 2006 г.): матэрыялы чытанняў. – Мн., 2006. – С.121 – 126.
4. Міхальчанка, А. Фотадакументы БелТА як гістарычныя крыніцы / А.Міхальчанка // Бел. гіст. часоп. – 2000. – № 4. – С.17 – 21.
5. Палхоўская, С.П. Калекцыя негатываў на шкле пра Ю.Ядкоўскага з фондаў ГДГАМ / С.П.Палхоўская // Краязн. запіскі. – Гродна, 2000. – Вып. 5. – 46 – 50.
6. Парфянок, У. Ян Булгак – легенда трох краін / У.Парфянок // Мастацтва. – 2001. – № 9. – С.37 – 44.
7. Саўчанка, Н. ―Гісторыя беларускай фатаграфіі" – асноўныя напрамкі, вынікі і перспектывы даследавання / Н. Саўчанка // Музейн. весн. – 2003. – Вып. 1. – С.55 – 58.
8. Саўчанка, Н. Творы і абліччы мінулага / Н.Саўчанка // Мастацтва. – 2002. – № 1. – С.37 – 41.
9. Саўчанка, Н. Вачыма фатографа / Н.Саўчанка // Наша вера. – 2003. – № 2. – С.82 – 84. (Мінск 1860 – 1870-х гг.).

**Дадатковая**

1. Булгак, Я. Край дзіцячых гадоў / Я.Булгак. – Мінск: , 2006. -
2. Казюля, Я. Крыжы Міхася Раманюка / Я.Казюля // Голас Радзімы. – 2001. – № 9. – С.5; № 20. – С.5.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Кухарска, Я. Ян Брунан Булгак (1876 – 1950) – забыты мастак Наваградзкае зямлі / Я.Кухарска; пер. з пол. мовы Н.Пятровіч // Спадчына. 2002. – №2/3. – С.143 – 158.
4. Харэўскі, С. Ян Булгак. Выгляд з Зарэчча / С.Харэўскі // Наша Ніва. – 1998 – 9 лют. (№3). – С.24.
5. Шунейка, Я. Непатапляльная каравела: (пра Я.Булгака) / Я.Шунейка // Мастацтва. – 2001. – № 2. – С.35 – 39.
6. Фотаальбомы гарадоў, раёнаў, абласцей. Выяўляюцца і характарызуюцца на практычнай рабоце па бягучых бібліяграфічных дапаможніках, каталогах бібліятэк, БД, падбіраюцца ў бібліятэцы БДУ культуры і ў іншых бібліятэках.
7. Сайты выяўляюцца і характарызуюцца на практычнай рабоце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СЕМІНАР

## Мемуарная літаратура - крыніца краязнаўчых ведаў, 4 гадзіны

*Пытанні для абмеркавання*

1. У якіх відах і жанрах ―мемуарнай літаратуры" змяшчаюцца каштоўныя звесткі пра беларускія рэгіёны?
2. Па артыкулу К.А.Бюруковіч (№ 1 спіса) раскрыйце значэнне мемуараў як крыніц інфармацыі ў краязнаўчай дзейнасці бібліятэк.
3. У чым заключаюцца асаблівасці адлюстравання беларускіх рэгіёнаў у:
   a. мемуарыстыцы XVII ст.?
   b. мемуарыстыцы XVIII ст.?
   c. мемуарыстыцы XIX – пачатку XX ст.?
   d. мемуарыстыцы савецкага перыяду?
   e. сучаснай мемуарыстыцы

### Літаратура

### Асноўная


1. Бирюкович, К.А. Мемуаристика: ее место и роль в краеведении / К.А.Бирюкович // Библиография. – 2003. – № 2 . – С.13 – 16.
2. Шутова, О.М. Опубликованные мемуарные источники по истории Беларуси 20-30-х гг. XX в. / О.М. Шутова // Тэзісы Міжнароднай навукова-тэарэтычнай канф. ―Архівазнаўства, крыніцазнаўства, гістарыяграфія Беларусі: стан і перспектывы", 1-2 снеж. 1993 г. Ч.1. – Мн., 1993. – 111 – 118.


### Дадатковая


1. Ходзін, С.М. Крыніцы гісторыі Беларусі: (гіст.-генет. і кампаратыўнае вывучэнне) / С.М.Ходзін. – Мн. :  БДУ, 1999. – С.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМАТЫКА І МЕТАДЫЧНЫЯ ЎКАЗАННІ

## ДЛЯ ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ
## ПРАКТЫЧНАЯ РАБОТА І

**Бібліяграфічны і фактаграфічны пошук па нарматыўна-прававых дакументах і дакументах справаводства аб рэгіёнах Беларусі**, 4 гадзіны

*Мэта:* пазнаёміцца з друкаванымі крыніцамі матэрыялаў заканадаўства і справаводства дарэвалюцыйнага перыяду, навучыцца вызначаць віды гэтых дакументаў, выканаць фактаграфічныя і бібліяграфічныя даведкі.

*Заданне і методыка выканання:* кожны студэнт выконвае 4 пісьмовыя даведкі. Вызначае іх від, крыніцы выканання, афармляе адказ адпаведна запыту.

*Выкананне*: правесці выяўленне крыніц, адказаць на прапанаваныя пытанні, ахарактарызаваць адлюстраваныя дадзеныя, структуру і даведачна-метадычны апарат выданняў. Аналізуюцца выпускі ―Памятных книжек... губерний", кнігі 28, 30, 43, 44, 70, 523 і іншыя кнігі Метрыка Вялікага княства Літоўскага.

Форма адказу

| Запыт | БА крыніцы пошуку | Адказ | Від заканадаўчага або справаводнага дакумента | Від даведкі |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

**Варыянт 1**

Заданне 1. Прадстаўнікі якіх рамёстваў утварылі агульны цэх у Менску ў снежні 1591 г.? Які дакумент павінен быў паказаць кожны рамеснік? Што павінен быў вырабіць кожны новы майстар цэха? У якім дакуменце адлюстроўваліся правілы цэха, хто яго падпісаў?

Заданне 2. Па дакументу 1588 г. ―Постановление о взыскании с лиц, не являющихся на заседания по гордским делам" вызначыць: 1) від дакумента, 2) імёны членаў Магілёўскай ратушы, 3) сутнасць справы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Заданне 3. У якіх кнігах сучасных выданняў Метрыкі Вялікага княства Літоўскага ёсць матэрыялы аб Васілішках (сёння вёска Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці). Складзіце спіс гэтых дакументаў (аналітычных бібліяграфічных запісаў).

Заданне 4. Прывядзіце некалькі імён татар з Клецка, якія былі ў войску ВКЛ у1528 г. (кніга 523)

**Варыянт 2**

Заданне 1. Дайце бібліяграфічнае апісанне граматы князя Вітаўта ад 3 красавіка 1399 г., у якой упамінаецца Рагачоў. Што, паводле граматы, не дазвалялася жыхарам Рагачова?

Заданне 2. Па дакументу 1588 г. ―Дело Максима Кислого с членами ратуши Могилевской» 1) падаць аўтэнтычную назву дакумента, 2) вызначыць яго від і сутнасць справы.

Заданне 3. Як пісалася назва населенага пункта Заслаўе (Заслаўль, зараз Мінскага раёна) у дакументах Метрыкі Вялікага княства Літоўскага?

Заданне 4. Які дакумент падцвердзіў маёмасныя правы полацкага мешчаніна Пятра Губы ў Полацкай зямлі? (кніга 70)

**Варыянт 3**

Заданне 1. Якія меры прадугледжваліся для аховы Гродна ад агню ў дакуменце 1680 г.? Дайце бібліяграфічнае апісанне гэтага дакумента. Назавіце (падкрэсліце) яго від. Пры якім каралю Рэчы Паспалітай ён быў прыняты?

Заданне 2. Па дакументу 1590 і 1591 гг. ―Обвинение Михаила Микитинича в святотатстве и смертный приговор» 1) назавіце імёны асоб, якія абвінавацілі М.Мікіцініча, 2) горад, дзе адбываўся суд, 3) з якой царквы і якія рэчы былі выкрадзены абвіначваемым?

Заданне 3. Якія віды афіцыйных дакументаў уключаны ў кнігу 70 Метрыкі Вялікага княства Літоўскага?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Заданне 4. Які запіс загадаў зрабіць Жыгімонт Аўгуст па справе забойства Андрэя Пацянькевіча? Хто звярнуўся да караля па справе? (Метрыка Вялікага княства Літоўскага, кніга 30).

**Варыянт 4**

Заданне 1. Прывядзіце звесткі аб ратушы ў Гродна паводле дакумента 1680 г. Дайце бібліяграфічнае апісанне дакумента, адзначце яго від. Пры якім каралю Рэчы Паспалітай ён быў зацверджаны?

Заданне 2. Па дакументу 1589 г. ”Обвинение в корчемстве Якима Богдановича” 1) прывядзіце аўтэнтычную назву дакумента і горад, дзе адбыўся суд, 2) якое рашэнне было прынята пры першым разглядзе справы?

Заданне 3. Якія асаблівасці паказальніка імёнаў і асоб у 560 кнізе Метрыкі Вялікага княства Літоўскага?

Заданне 4. Якая спадчына была адпісана Альжбеце Ерданаўне яе мужам Себасцьянам Мікалаевічам Трацціяком паводле дакументаў 2 верасня 1565 г. (кніга 46).

**Варыянт 5**

Заданне 1. Дзе і кім заслухоўвалася судовая справа паміж магіляўчанамі Грышкам Яцковічам, Гасютай і Іванам Клыначамі ў 1579 г.? Якое рашэнне было прынята?

Заданне 2. Прачытайце дакументы па судовай справе паміж магіляўчанамі Нелідаю Цішковіч і Клышкам Іванавічам у 1579 г. Дзе заслухоўвалася справа. У чым яе змест?

Заданне 3. Якія асаблівасці геаграфічнага паказальніка ў кнізе 46 Метрыкі Вялікага княства Літоўскага?

Заданне 4. Які дакумент засведчыў правы на землі мсціслаўскіх баяр Пятровічаў, як іх звалі? (кніга 30).

**Варыянт 6**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Заданне 1. Якія населеныя пункты, акрамя Менска, кароль Уладзіслаў перадаў у валоданне Скіргайлу паводле граматы 1387 г.? Дзе захоўваецца грамата?

Заданне 2. Па дакументу 1590 г. ―Избрание плотниками в старосты Харка Нестеровича” 1) вызначце від дакумента, 2) укажыце, для якіх мэт выбіраўся стараста, 3) у якім горадзе?

Заданне 3. Якія дакументы ўключаны ў кнігу 30 Метрыкі Вялікага княства Літоўскага? Дайце сучаснае тлумачэнне некалькіх тэрмінаў.

Заданне 4. Ад якіх падаткаў вызваляліся васілішскія мяшчане (Васілішкі) паводле прывілеяў Жыгімонта Аўгуста і Стэфана Баторыя? (кніга 70).

**Варыянт 7**

Заданне 1. Дайце бібліяграфічнае апісанне указа (вытрымкі) Кацярыны II, прысвечанага населенаму пункту Дуброўна (зараз раённы цэнтр Віцебскай вобласці). У чым сэнс дакумента?

Заданне 2. Па дакументу 1580 г. ―Смертный приговор Комаровичу за кражу лошади” прывесці 1) аўтэнтычную назву справы, 2) імёны магіляўчан, якія падалі судовы іск.

Заданне 3. Прывядзіце некалькі імён кобрынскіх баяр, якія паставілі коней у войска ВКЛ 1528 г. Ці былі сярод іх жанчыны? (кніга 523).

Заданне 4. Якія асаблівасці прадметнага паказальніка ў кнізе 46 Метрыкі Вялікага княства Літоўскага?

**Варыянт 8**

Заданне 1. Дайце бібліяграфічнае апісанне інвентара маёнтка Малая Арава ад 24.11.1742 г. (Зараз Круглянскі раён). Ахарактэрызуйце змест дакумента.

Заданне 2. Па дакументу 1585 г. ―Разводный лист, данный по случаю голода Андреем Окулиничем своей жене Марье” 1) пералічыць пасады чыноўнікаў ратушнага суда ў Магілёве, 2) даць іх тлумачэнне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Заданне 3. Якія асаблівасці паказальніка імён ў кнізе 46 Метрыкі Вялікага княства Літоўскага?

Заданне 4. Якія дакументы аб Мінску змешчаны ў сучасных выданнях Метрыкі Вялікага княства Літоўскага, выдадзеных у Літве? Складзіце спіс 2-3 аналітычных бібліяграфічных запісаў.

**Варыянт 9**

Заданне 1. Прачытайце дакументы 1585 г. аб смяротным пакаранні жыхароў г.Магілёва Філіпа Козла і Івана Лаўровіча. У якім судзе слухалася справа? Якое правапарушэнне інкрымініравалася абвінавачаным?

Заданне 2. Які дакумент быў прыняты 4.03.1926 г. адносна гарадской гміны Лунінец? Дайце яго бібліяграфічнае апісанне і каротка вызначце змест.

Заданне 3. Якія дакументы аб Гродна змешчаны ў сучасных выданнях Метрыкі Вялікага княства Літоўскага, выдадзеных у Літве? Складзіце спіс 2-3 аналітычных бібліяграфічных запісаў.

Заданне 4. Прывядзіце прыклады найбольш распаўсюджаных жаночых і мужчынскіх імён у першай палове 16 ст. па выданнях Метрыкі Вялікага княства Літоўскага.

**Варыянт 10**

Заданне 1. Дайце бібліяграфічнае апісанне прывілея ад 19.01.1776 г., у якім ўпамінаецца Барысаўскі рэгіён. Які статус меў гэты рэгіён?

Заданне 2. Які дакумент быў прыняты 28. 03. 1938 г. адносна г. Баранавічы? Дайце яго бібліяграфічнае апісанне і каротка вызначце змест.

**Варыянт 11**

Заданне 1. Які дакумент быў прыняты 21.03.1938 г. адносна г. Ліда? Дайце яго бібліяграфічнае апісанне і каротка вызначце змест.

Заданне 2. Дайце бібліяграфічнае апісанне імяннога указа Сенату ад 11 ліпеня 1802 г., які датычыўся Гродзенскай губерні. Раскрыйце яго змест.

**Варыянт 12**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Заданне 1. Які дакумент быў уведзены ў дзеянне 1.04.1927 г. адносна змены граніц гарадской гміны Ваўкавыск у Ваўкавыскім павеце? Дайце яго бібліяграфічнае апісанне.

Заданне 2. Хто выдаў грамату князю К.Лукомскаму 11.04.1571 г.? Дайце яе бібліяграфічнае апісанне каротка ахарактарызуйце змест. (Уладарыў на землях сучаснага Чашніцкага раёна).

**Варыянт 13**

Заданне 1. Дайце бібліяграфічнае апісанне указа Кацярыны II, прысвечанага населенаму пункту Дуброўна (зараз раённы цэнтр). Перакажыце змест матэрыялу.

Заданне 2. Які дакумент быў прыняты 27.12.1925 г. адносна ліквідацыі сельскіх гмін Чарняхова і Паланечка ў Баранавіцкім павеце? Ахарактарызуйце яго змест ?

**Крыніцы**

Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі “Памяць”.

“Историко-юридические материалы…” (Витебск)

“Актовые книги…” (Вильно)

“Dzenniki ustaw Rzeczy Pospolitej Polskej” (Warszawa, 1920 – 1939)

Літоўская метрыка, усе сучасныя выданні.

***Заданне 2. Па “Памятных книжках... губерний”:***

1) дайце бібліяграфічнае апісанне выпуска;

2) ахарактарызуйце ў цэлым структуру выдання;

3) назавіце поўнае імя тагачаснага губернатара;

4) прывядзіце звесткі аб насельніцтве аднаго з гарадоў (мястэчка) і яго эканамічнай дзейнасці;

5) назавіце па адной царкве трох-чатырох рэлігійных канфесій губерні (ці аднаго павета) з указаннем звестак пра святароў;

6) назавіце некалькі тыпаў навучальных устаноў, з указаннем месца іх знаходжання, звестак аб педагогах;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7) ці змешчаны ў гэтым выданні артыкулы краязнаўчага зместу?

*“Памятныя кніжкі” губерняў заказваюцца ў НББ ці ЦБ НАН. Выбар кніжкі па жаданні студэнта.*

***Заданне 3. Па кнігах Метрыкі Вялікага княства Літоўскага:***

1) дайце бібліяграфічнае апісанне кнігі;

2) ахарактарызуйце ў цэлым структуру выдання;

3) якія дакументы ўключаны ў выданне;

4) якія маюцца паказальнікі да выдання? Ахарактэрызуйце структуру геаграфічных і персанальных рубрык у паказальніках;

4) здзейсніце пошук матэрыялу па аднаму геаграфічнаму аб’екту (населенаму пункту) і па адной персаналіі.

**Крыніцы**

Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кн. 43 (1523 – 1560). – Мн. : Бел. навука, 2003. – 167 с.

Перапіс войска Вялікага княства Літоўскага 1528 года. Кн. 523. – Мн.: 2003. – Паказ. імёнаў, геагр. С.180 – 443.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРАКТЫЧНАЯ РАБОТА 2

**Крыніцы геральдыкі і генеалогіі**, 8 гадзін

*Мэта:* пазнаёміцца з крыніцамі геральдыкі і генеалогіі, правесці пошук гербоў і генеалагічных звестак.

*Выкананне*: на падставе навуковай, даведачнай і іншай літаратуры кожны студэнт павінен падрыхтаваць пісьмовыя адказы на прыведзеныя пытанні. Пытанні 1-10 выконваюцца кожным студэнтам, пытанні 11 – 21 – індывідуальныя.

*Пытанні:*

***Заданне 1.*** Якія групы (віды) гербоў вылучаюцца паводле сучаснай класіфікацыі?

***Заданне 2.*** Ахарактарызуйце некалькі асноўных фігур гербоў.

***Заданне 3.*** Прывядзіце прыклад ―мовячага герба".

***Заданне 4.*** На якія групы падзяюцца гербы прыватных асоб? Чым яны адрозніваюцца?

***Заданне 5.*** Прывядзіце прыклады гербоў беларускіх магнатаў.

***Заданне 6.*** Ахарактэрызуйце сучасны герб Мінска і аднаго іншага беларускага горада (на выбар). Прывядзіце гістарычныя звесткі пра гэты герб.

***Заданне 7.*** Назавіце групы карпарацыйных гербаў. Прывядзіце прыклад цэхавага герба.

***Заданне 8.*** Як выкарыстоўваўся ў канфесійнай геральдыцы Беларусі сімвал крыжа?

***Заданне 9.*** Прывядзіце прыклады выкарыстання ў беларускай прыватнай геральдыцы сімвалаў мусульманскага Усходу.

***Заданне 10.*** На аснове гербоўніка К.Нясецкага назавіце прозвішчы полацкіх кашталянаў з 1569 г. да апошняй чвэрці XVIII ст.

***Заданне 11. На аснове гербоўніка К.Нясецкага*** (ці іншай крыніцы) адшукайце гербы беларускіх ваяводстваў (Віцебскага, Віленскага, Навагрудскага, Мінскага, Полацкага ці інш.). [S. 549 – XIII Herby Litewskie...]

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Заданне 12. На аснове аднаго сучаснага гербоўніка беларускай шляхты адкажыце на пытанні*:**

1. значэнне данага гербоўніка
2. характарыстыка структуры гербоўніка ў цэлым
3. межы якой тэрыторыі гербоўнік ахоплівае
4. якія крыніцы былі выкарыстаны для падрыхтоўкі гербоўніка?
5. якія праблемныя пытанні вырашаліся складальнікамі?
6. наколькі інфармацыя ў гербоўніку з'яўляецца поўнай, ці даецца больш-менш цэласнае прадстаўленне па гісторыі рода?
7. як прадстаўлена ў гербоўніку бібліяграфічная інфармацыя?

***Заданне 13. На аснове гербоўніка К.Нясецкага (ці іншай крыніцы) назавіце прозвішчы ваяводаў аднаго з беларускіх ваяводстваў ў перыяд ВКЛ.***

***Заданне 14. На аснове гербоўніка К.Нясецкага ці іншых адкажыце на пытанні:***

1. У якіх беларускіх ваяводствах і землях жыў у XVII – XVIII стст. род Астанкевічаў (Останкевічаў)?

2. Які герб меў шляхецкі род Пракаповічаў з Навагрудчыны?

3.Які герб меў беларускі шляхецкі род Талько і ў якім ваяводстве быў расселены?

4.Знайдзіце апісанне гербу Трубы (Trąby).

5.Які герб меў беларускі шляхецкі род Танаеўскіх (Tanajewski) і ў якім ваяводстве быў расселены?

6.Які герб меў беларускі шляхецкі род Тупік (Typik) і дзе быў расселены?

7.Які герб меў беларускі шляхецкі род Тур (Tur) і дзе быў расселены?

8.Які герб меў беларускі шляхецкі род Віткоўскіх (Witkowski) і дзе быў расселены?

9.Які герб меў беларускі шляхецкі род Слізень (Slizień) і дзе быў расселены?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Заданне 15. На аснове 1-2 выданняў ("Гербы городов, губерний, областей и посадов Российской империи, внесенные в полное собрание законов с 1649 по 1900 год. / Сост. П.Г. Винклер. –М.: Планета, 1990; "Энцыклапедыя гісторыі Беларусі" ) здзейсніце пошук:***

1. калі быў зацверджаны герб г. Барысава? Дайце яго апісанне.
2. калі быў зацверджаны герб г. Беластока? Дайце яго апісанне.
3. калі быў зацверджаны герб г. Вілейка? Дайце яго апісанне.
4. калі быў зацверджаны герб г. Ваўкавыска? Дайце яго апісанне.
5. калі быў зацверджаны герб г. Гродна? Дайце яго апісанне.
6. калі быў зацверджаны герб г. Ігумена? Дайце яго апісанне.
7. калі быў зацверджаны герб г. Заслаўля? Дайце яго апісанне.
8. калі быў зацверджаны герб г. Дрысы? Дайце яго апісанне.
9. калі быў зацверджаны герб г. Ліды? Дайце яго апісанне.
10. калі быў зацверджаны герб г. Клімавічы? Дайце яго апісанне.
11. калі быў зацверджаны герб г. Магілёва? Дайце яго апісанне.
12. калі быў зацверджаны герб г. Пінска? Дайце яго апісанне.
13. калі быў зацверджаны герб г. Рэчыца? Дайце яго апісанне.
14. калі быў зацверджаны герб Віцебскай губерні? Дайце яго апісанне.
15. калі быў зацверджаны герб Віленскай губерні? Дайце яго апісанне.
16. калі быў зацверджаны герб Гродзенскай губерні? Дайце яго апісанне.
17. калі быў зацверджаны герб Магілёўскай губерні? Дайце яго апісанне.
18. калі быў зацверджаны герб Мінскай губерні? Дайце яго апісанне.

***Заданне 16. На аснове "Малога гербоўніка Наваградскай шляхы" адкажыце на пытанні:***

1. якія шляхецкія роды карысталіся гербам Абданк?
2. якія шляхецкія роды карысталіся гербам Магіла?
3. якія шляхецкія роды карысталіся гербам Порай?
4. якія шляхецкія роды карысталіся гербам Ястрабец?
5. якія шляхецкія роды карысталіся гербам Трубы?
6. якія шляхецкія роды карысталіся гербам Сыракомля?
7. хто выводзіўся з роду Літоўскіх?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8. хто выводзіўся з роду Маеўскіх?
9. хто выводзіўся з роду Малюшыцкіх?
10. хто выводзіўся з роду Абламовічаў?
11. хто выводзіўся з роду Анцутаў?
12. які герб мелі Збароўскія? Калі яны былі прызнаны ў расійскім дваранстве?
13. які герб мелі Ігнатовічы? Якімі фальваркамі валодалі прадстаўнікі роду?

***Заданне 17. На аснове “Гербоўніка Халопенічскай шляхы” адкажыце на пытанні:***

1. Які герб мелі Янушкоўскія шляхціцы Халопенічскага павету? Калі яны былі прызнаны ў расійскім дваранстве?
2. Які герб мелі Барэйшы шляхціцы Халопенічскага павету? Калі яны былі прызнаны ў расійскім дваранстве?
3. Які герб мелі Аскеркі шляхціцы Халопенічскага павету? Колькі разоў яны падавалі дакументы на прызнанне ў расійскім дваранстве?
4. Які герб мелі Ханецкія шляхціцы Халопенічскага павету? Хто першым з гэтага роду атрымаў шляхецтва? Якім маёнткам валодаў Міхал Ханецкі? Ці была ўласная зямля ў яго нашчадкаў?
5. Які герб мелі неафіты Яроцкія? Хто і калі першым з гэтага роду атрымаў шляхецтва?

***Заданне 18. На аснове даведніка Ч. Малеўскага “Роды шляхецке в повеце Лідскім в XIX ст. (Cz. Malewski. Rody szlacheckie w powiecie Lidzkim w XIX wieku. – Czas: Wilno, 2002.- 113 s.) адкажыце на пытанні:***

1. Які герб мелі шляхціцы Забелы? Назавіце некалькі пасяленняў, якімі яны валодалі.
2. Які герб мелі шляхціцы Шукевічы? Назавіце пасяленні, якімі яны валодалі.
3. Які герб мелі шляхціцы Міцкевічы? Назавіце пасяленні, якімі яны валодалі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Які герб мелі шляхціцы Барташэвічы? Назавіце пасяленні, якімі яны валодалі.
5. Які герб мелі шляхціцы Клімовічы? Назавіце пасяленні, якімі яны валодалі.
6. Які герб мелі шляхціцы Ігнатовічы? Назавіце пасяленні, якімі яны валодалі.
7. Які герб мелі шляхціцы Буткевічы? Назавіце пасяленні, якімі яны валодалі.
8. Які герб мелі шляхціцы Булгакі? Назавіце пасяленні, якімі яны валодалі.
9. Які герб мелі шляхціцы Колышкі?

***Заданне19. На аснове "Гербоўніка пінскай засцянковай шляхты" Р.Гарашкевіча:***

1. Прывядзіце 2прыклады мясцовых прозвішчаў.
2. Назавіце гербы гэтых родаў.

***Заданне 20. На аснове "Гербоўніка беларускай шляхты" адкажыце на пытанні:***

1. Які герб мелі шляхціцы татарскага паходжання Александровічы? Як звалі сыноў прадстаўніка трэцяга калена Разеба Александровіча? У якім годзе яны былі прызнаны ў расійскім дваранстве і калі зацверджаны ўказам Сената?
2. Які герб мелі шляхціцы Акінчыцы? У якім годзе нарадзіўся прадстаўнік восьмага калена Вікенці? Як звалі яго бацьку? Ці было зацверджана іх дваранства указам Сената Расійскай імперыі?
3. Які герб мелі шляхціцы Акулічы? У якім годзе нарадзіўся прадстаўнік шостага калена Канстанцін? Якія ёе атрымаў пасады і ўзнагароды? Ці прадоўжыў ён род па мужчынскай лініі?

***Заданне 21. Па "Алфавитным спискам дворянских родов…" адной з беларускіх губерняў прывесці прыклады прозвішчаў дваран з трох паветаў.***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для падрыхтоўкі адказаў выкарыстоўваецца выданні па геральдыцы і геналогіі бібліятэкі БДУ культуры, 6 гадзін лабараторнай работы праводзяцца ў ЦБ НАН ці НББ.

**Крыніцы:**


―Энцыклапедыя гісторыі Беларусі” у 6 т.

―Алфавитный список дворянским родам, внесенным в дворянскую родословную книгу Витебской губернии с 1785 по 1900 годы” (Витебск, 1900),

―Алфавитный список дворянским родам Минской губернии, внесенным в дворянскую родословную книгу по 1 июля 1903 года” (Минск, 1903)

―Алфавитный список дворянским родам, внесенным в родословные дворянские книги Могилевской губернии” (Могилев, 1909)

―Алфавитный список дворянских родов Гродненской губернии, внесенных дворянскую родословную книгу” (Гродно, 1900)

Яцкевіч З. Малы гербоўнік халопеніцкай шляхты / З.Яцкевіч – Мн.: Бел. кнігазбор., 1999. – 494 с.

Dziadulewicz Ct. ―Herbarz rodzin tatarskich w Polsce” (Wilno, 1929)

Niesecki K. ―Herbarz Polski” (Lipsk, 1839-1845)

Винклер П.Г. ―Гербы городов, губерний, областей и посадов Российской империи, внесенные в полное собрание законов с 1649 по 1900 год. (Москва, 1990)

―Spis szlachty wylegitomowanej w guberniach Grodzieńskiej, Mińskiej, Mohylewskiej i Witebskiej” (Warszawa, 1992)

Malewski Cz. ―Rody szlacheckie w powiecie Lidzkim w XIX wieku” (Wilno, 2002) і інш.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРАКТЫЧНАЯ РАБОТА 3

**Крыніцы тапанімікі**, 8 гадзін

*Мэта:* пазнаёміцца з крыніцамі тапанімікі розных гістарычных перыядаў і іх выданнямі.

*Выкананне*: правесці выяўленне крыніц, адказаць на прапанаваныя пытанні, ахарактарызаваць адлюстраваныя дадзеныя, структуру і даведачна-метадычны апарат выданняў. Варыянты па 10 індывідуальных пошукавых задач фарміруюцца выкладчыкам на аснове заданняў 1-3, улічваецца месца нараджэння студэнта і яго родных. Заданні 4-6 выконваюцца ўсімі студэнтамі.

***Заданне 1. Па "Памятных книжках» беларускіх губерняў у перыяд Расійскай імперыі адказаць на пытанні:***

1. У якой воласці і павеце Мінскай губерні знаходзілася Давід-Гарадокскае народнае вучылішча?
2. У якой воласці і павеце Мінскай губерні знаходзілася Жыткавічскае народнае вучылішча?
3. У якой воласці і павеце Мінскай губерні знаходзілася Навагрудскае народнае вучылішча?
4. У якой воласці і павеце Мінскай губерні знаходзілася Пінькавічскае народнае вучылішча?
5. У якой воласці і павеце Мінскай губерні знаходзілася Слабада-Скрыгалаўскае народнае вучылішча?
6. У якой воласці і павеце Мінскай губерні знаходзілася Столінскае народнае вучылішча?
7. У якой воласці і павеце Мінскай губерні знаходзілася Стаўбцоўскае народнае вучылішча? Як пісалася назва населенага пункта?
8. У які павет Мінскай губерні ўваходзілі Лоеўская і Нараўлянская воласці?
9. У які павет Мінскай губерні ўваходзілі Клецкая і Ляхавічская воласці?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

10. У які павет Мінскай губерні ўваходзілі Карэлічская, Мірская і Цырынская валасці?
11. У які павет Мінскай губерні ўваходзілі Лемяшэвічская і Лунінская валасці?
12. У які павет Мінскай губерні ўваходзілі Лельчыцкая і Ленінская валасці?
13. У які павет Мінскай губерні ўваходзілі Дукорская і Уздзенская валасці?
14. У які павет Мінскай губерні ўваходзілі Лагойская і Мсціжская валасці?
15. У які павет Мінскай губерні ўваходзілі Азарычская і Свіслачская валасці?
16. У які павет Мінскай губерні ўваходзілі Івянецкая, Ракаўская і Сенніцкая валасці?
17. Назавіце 3 навучальныя ўстановы Пінскага павету Мінскай губерні ў пачатку ХХ ст.
18. Прывядзіце назвы банкаў, якія існавалі ў Мінску ў 1905 г.
19. Прывядзіце назвы медыцынскіх устаноў, якія існавалі ў Мінску ў 1905 г.
20. Назавіце горад Мінскай губерні, у якім у 1905 г. было найменш жыхароў. Прывядзіце колькасць жанчын і мужчын.
21. Назавіце 3 буйнейшыя гарады Мінскай губерні ў 1905 г. па колькасці жыхароў.
22. Колькі жыхароў было ў 1905 г. ў Рэчыцы Мінскай губерні, якая канфесія пераважала? Укажыце тып гэтага населенага пункта.
23. Колькі жыхароў было ў 1905 г. ў Нясвіжы Мінскай губерні, якая канфесія пераважала? Укажыце тып гэтага населенага пункта.
24. Колькі жыхароў было ў 1905 г. ў Слуцку Мінскай губерні, якая канфесія пераважала? Укажыце тып гэтага населенага пункта.
25. Колькі жыхароў было ў 1905 г. ў Ігумене Мінскай губерні, якая канфесія пераважала? Укажыце тып гэтага населенага пункта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

26. Колькі жыхароў было ў 1905 г. ў Барысаве Мінскай губерні, якая канфесія пераважала? Укажыце тып гэтага населенага пункта.
27. Колькі жыхароў было ў 1905 г. ў Мінску, якая канфесія пераважала? Укажыце тып гэтага населенага пункта.
28. Колькі жыхароў было ў 1905 г. ў Бабруйску Мінскай губерні, якая канфесія пераважала? Укажыце тып гэтага населенага пункта.
29. Колькі жыхароў было ў 1905 г. ў Навагрудку Мінскай губерні, якая канфесія пераважала? Укажыце тып гэтага населенага пункта.
30. Назавіце тып гарадского населенага пункта Друскенікі Гродзенскай губерні. Укажыце, да якога павету ён адносіўся, колькі было ў ім жыхароў і якая адлегласць да губернскага цэнтра.
31. Назавіце тып гарадского населенага пункта Брэст-Літоўск Гродзенскай губерні. Укажыце, да якога павету ён адносіўся, колькі было ў ім жыхароў і якая адлегласць да губернскага цэнтра.
32. Назавіце тып населенага пункта Зэльва Гродзенскай губерні. Укажыце, да якога павету ён адносіўся, колькі было ў ім жыхароў і якая адлегласць да губернскага цэнтра.
33. Назавіце тып населенага пункта Лунна Гродзенскай губерні. Укажыце, да якога павету ён адносіўся, колькі было ў ім жыхароў і якая адлегласць да губернскага цэнтра.
34. Назавіце тып населенага пункта Скідэль Гродзенскай губерні. Укажыце, да якога павету ён адносіўся, колькі было ў ім жыхароў і якая адлегласць да губернскага цэнтра.
35. Назавіце тып населенага пункта Масты Гродзенскай губерні. Укажыце, да якога павету ён адносіўся, колькі было ў ім жыхароў і якая адлегласць да губернскага цэнтра.
36. Назавіце тып населенага пункта Высокае Літоўскае Гродзенскай губерні. Укажыце, да якога павету ён адносіўся, колькі было ў ім жыхароў і якая адлегласць да губернскага цэнтра.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

37. Назавіце тып населенага пункта Пружаны Гродзенскай губерні. Укажыце, да якога павету ён адносіўся, колькі было ў ім жыхароў і якая адлегласць да губернскага цэнтра.
38. Назавіце тып населенага пункта Іванава Гродзенскай губерні. Укажыце, да якога павету ён адносіўся, колькі было ў ім жыхароў і якая адлегласць да губернскага цэнтра.
39. Назавіце тып населенага пункта Камянец-Літоўскі Гродзенскай губерні. Укажыце, да якога павету ён адносіўся, колькі было ў ім жыхароў і якая адлегласць да губернскага цэнтра.
40. Назавіце тып населенага пункта Косава Гродзенскай губерні. Укажыце, да якога павету ён адносіўся, колькі было ў ім жыхароў і якая адлегласць да губернскага цэнтра.
41. Назавіце тып населенага пункта Кобрын Гродзенскай губерні. Укажыце, да якога павету ён адносіўся, колькі было ў ім жыхароў і якая адлегласць да губернскага цэнтра.
42. Назавіце тып населенага пункта Малеч Гродзенскай губерні. Укажыце, да якога павету ён адносіўся, колькі было ў ім жыхароў і якая адлегласць да губернскага цэнтра.
43. Назавіце праваслаўныя цэрквы і іх адрасы ў г. Горкі Магілёўскай губерні ў пачатку XX ст.
44. Назавіце касцёлы ў і іх адрасы ў Горацкім павеце Магілёўскай губерні ў пачатку XX ст.
45. Які манастыр быў у Гомелі ў пачатку XX ст. Укажыце адрас.
46. Назавіце 3 навучальныя ўстановы ў Гомелі Магілёўскай губерні ў пачатку XX ст., укажыце іх адрасы.
47. Прывядзіце назвы навучальных ўстаноў, якія былі ў 1865 г. у Клімавічскім павеце Магілёўскай губерні.
48. Прывядзіце назвы навучальных ўстаноў, якія былі ў 1865 г. у Аршанскім павеце Магілёўскай губерні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

49. Прывядзіце назвы навучальных ўстаноў, якія былі ў 1865 г. у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні.
50. Прывядзіце назвы навучальных ўстаноў, якія былі ў 1865 г. у Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні.
51. Прывядзіце назвы навучальных ўстаноў, якія былі ў 1865 г. у Быхаўскім павеце Магілёўскай губерні.
52. Прывядзіце назвы навучальных ўстаноў, якія былі ў 1865 г. у Мсціслаўскім павеце Магілёўскай губерні.
53. Назавіце конныя станцыі ад Оршы да Клімавіч Магілёўскай губерні, існаваўшыя ў 1865 г.
54. Назавіце медыцынскія ўстановы, якія ўснавалі ў 1865 г. у Магілёве.
55. У якіх гарадах Гомельскага павету ў пачатку XX ст. былі аддзяленні Саюза рускага народа (чарнасоценцаў). Укажыце саслоўны склад кіраўніцтва аддзяленняў Саюза.
56. Прывядзіце назвы і адрасы бальніц у Магілёве ў пачатку XX ст.
57. Па якому адрасу размяшчалася Паліцэйская стража Магілёўскай губерні ў пачатку XX ст.?
58. Па якому адрасу размяшчаўся ў Магілёве ў пачатку XX ст. Настаўніцкі інстытут?

**Крыніцы**

–Памятная книжка Гродненской губернии на 1888 год” (Гродно, 1888).
–Памятная книжка Минской губернии на 1893 год” (Минск, 1892).
–Памятная книжка Минской губернии на 1893 год” (Минск, 1892).
–Памятная книжка Могилевской губернии на 1865 год”. (Могилев на Днепре, 1865).
–Памятная книжка Могилевской губернии на 1914 год”. (Могилев, 1914).

***Заданне 2. Па выпусках “Skorowidz miejscowościej RPP…” (“Паказальнік мясцовасцей Рэчы Паспалітай Польскай...”. Ваяводствы Палескае, Віленскае, Навагрудскае.), прысвечаных асобным ваяводствам, адказаць на пытанні:***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Запішыце ў арыгінале тагачасную назву Брэста. Адзначце тып гэтага населенага пункта. Колькі жанчын і мужчын пражывала на 30.09.1921 г. у Брэсце-над-Бугам? Колькі жыхароў спавядалі праваслаўную, каталіцкую і іўдзейскую веру.?
2. Колькі гарадскіх пасяленняў было на 30.09.1921 г. у павеце Брэст-над-Бугам Палескага ваяводства? Запішыце ў арыгінале тагачасныя назвы. Колькі жыхароў было ў Камянцы? Прывядзіце лічбы трох пераважаючых канфесій і нацыянальнасцей. Зрабіце вывады на аснове сапастаўлення гэтых паказчыкаў.
3. Колькі гарадскіх пасяленняў было на 30.09.1921 г. у Драгічынскім павеце Палескага ваяводства? Адзначце іх тып. Як зараз называецца Янаў? Запішыце ў арыгінале тагачасную назву. Колькі было ў ім жыхароў. Прывядзіце лічбы трох пераважаючых канфесій і нацыянальнасцей. Зрабіце вывады на аснове сапастаўлення гэтых паказчыкаў.
4. Колькі гарадскіх пасяленняў было на 30.09.1921 г. у Кобрынскім павеце Палескага ваяводства? Адзначце іх тып. Запішыце ў арыгінале тагачасныя назвы. Прывядзіце лічбы трох пераважаючых канфесій і нацыянальнасцей. Зрабіце вывады на аснове сапастаўлення гэтых паказчыкаў.
5. Колькі гарадскіх пасяленняў было на 30.09.1921 г. у гміне Косава Палескага ваяводства? Запішыце ў арыгінале тагачасныя назвы. Адзначце іх тып. Прывядзіце лічбы трох пераважаючых канфесій і нацыянальнасцей. Зрабіце вывады на аснове сапастаўлення гэтых паказчыкаў.
6. Колькі гарадскіх пасяленняў было на 30.09.1921 г. у гміне Лунінец Палескага ваяводства? Запішыце ў арыгінале тагачасныя назвы. Адзначце іх тып. Прывядзіце лічбы трох пераважаючых канфесій і нацыянальнасцей. Зрабіце вывады на аснове сапастаўлення гэтых паказчыкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. Колькі гарадскіх пасяленняў было на 30.09.1921 г. у Пінскім павеце Палескага ваяводства? Запішыце ў арыгінале тагачасныя назвы. Адзначце іх тып. Прывядзіце лічбы трох пераважаючых канфесій і нацыянальнасцей. Зрабіце вывады на аснове сапастаўлення гэтых паказчыкаў.
8. Укажыце тып пасялення Пружаны Брэсцкага ваяводства. Колькі жанчын і мужчын пражывала ў ім на 30.09.1921 г. ? Запішыце ў арыгінале тагачасную назву. Прывядзіце лічбы трох пераважаючых канфесій і нацыянальнасцей. Зрабіце вывады на аснове сапастаўлення гэтых паказчыкаў.
9. Колькі гарадскіх пасяленняў было на 30.09.1921 г. у Дунілавічскім павеце Віленскага ваяводства? Да якога тыпу пасяленняў належалі Докшыцы? Запішыце ў арыгінале тагачасную назву. Колькі было ў Докшыцах жыхароў? Прывядзіце лічбы трох пераважаючых канфесій і нацыянальнасцей. Зрабіце вывады на аснове сапастаўлення гэтых паказчыкаў.
10. Укажыце тыпы наседеных пунктаў пад назвай Будслаў у гміне Будслаў у Дунілавічскім павеце Віленскага ваяводства. Запішыце ў арыгінале тагачасную назву. Колькі жыхароў было ў кожным з іх? Прывядзіце лічбы двух – трох пераважаючых канфесій і нацыянальнасцей. Зрабіце вывады на аснове сапастаўлення гэтых паказчыкаў.
11. Укажыце тыпы населеных пунктаў пад назвай Мядзел Стары і Мядзел Новы ў гміне Мядзел у Дунілавічскім павеце Віленскага ваяводства. Колькі жыхароў было ў кожным з іх? Прывядзіце лічбы трох пераважаючых канфесій і нацыянальнасцей. Зрабіце вывады на аснове сапастаўлення гэтых паказчыкаў.
12. Колькі гарадскіх пасяленняў было на 30.09.1921 г. у гміне Паставы Віленскага ваяводства? Укажыце тып гэтага пасялення. Укажыце тып пасялення пад над назвай Антонава ў гэтай гміне. Запішыце ў арыгінале тагачасныя назвы. Прывядзіце лічбы двух – трох

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пераважаючых канфесій і нацыянальнасцей у Антонава. Зрабіце вывады на аснове сапастаўлення гэтых паказчыкаў.

13. Колькі гарадскіх пасяленняў было на 30.09.1921 г. у Дзісненскім павеце Віленскага ваяводства? Запішыце ў арыгінале тагачасныя назвы. Укажыце тыпы пасяленняў. Колькі жыхароў было ў Глыбокім? Прывядзіце лічбы трох пераважаючых канфесій і нацыянальнасцей. Зрабіце вывады на аснове сапастаўлення гэтых паказчыкаў.
14. Прывядзіце тып пасялення пад назвай Алейнікі ў гміне Друя Дзісненскага павету Віленскага ваяводства. Запішыце ў арыгінале тагачасную назву. Прывядзіце лічбы двух – трох пераважаючых канфесій і нацыянальнасцей. Зрабіце вывады на аснове сапастаўлення гэтых паказчыкаў.
15. Колькі было на 30.09.1921 г. населеных пунктаў пад назвай Аляксандрава.у гміне Міоры Дзісненскага павету Віленскага ваяводства? Запішыце ў арыгінале тагачасныя назвы. Укажыце тыпы пасяленняў. Прывядзіце лічбы двух – трох пераважаючых канфесій і нацыянальнасцей. Зрабіце вывады на аснове сапастаўлення гэтых паказчыкаў.
16. Колькі гарадскіх пасяленняў было на 30.09.1921 г. у Вілейскім павеце Віленскага ваяводства? Запішыце ў арыгінале тагачасныя назвы. Укажыце тыпы пасяленняў. Колькі жыхароў пражывала ў Радошкавічах і Вілейцы? Прывядзіце лічбы трох пераважаючых канфесій і нацыянальнасцей. Зрабіце вывады на аснове сапастаўлення гэтых паказчыкаў.

**Крыніцы**

– Skorowidz miejscowoścej RPP . Woewództwo Poleskie. 1921”. (Warszawa, 1921).
– Skorowidz miejscowoścej RPP . Woewództwo Wileńskie. 1921”. (Warszawa, 1921).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРАКТЫЧНАЯ РАБОТА 4

**Фотадакументы як крыніцы краязнаўчай інфармацыі,** 4 гадзіны

*Мэта:* Вывучэнне фотадакументаў, прысвечаных рэгіёнам і населеным пунктам, асаблівасцей іх навуковага і бібліяграфічнага апісання.

*Выкананне*: азнаёміцца з фотаальбомамі, на падставе даведачнай, навуковай, навукова-папулярнай і іншай літаратуры азнаёміцца з выданнямі, якія маюць фотаілюстрацыі, выявіць фотамайстроў.

***Заданне 1. Выяўленне апублікаваных фотадакументаў па бібліяграфічных крыніцах.***

Кожнаму студэнту на падставе выпускаў ―Летапісу выяўленчага мастацтва" падабраць:

1. камплект фатаграфій (фотапаштовак), прысвечаных гораду, адміністрацыйна-тэрытарыльнай адзінцы, прыроднаму аб'екту ці іншай таксанамічнай адзінцы.

2. фотаальбом, прысвечаны рэгіёну ці населенаму пункту.

3. каляндар, прысвечаны любому рэгіянальнаму аб'екту, у афармленні якога выкарыстана фатаграфія.

***Заданне 2. Вывучэнне фотаальбомаў.***

Даць характарыстыку двух фотаальбомаў, прысвечаных адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінцы, населенаму пункту, фізіка-геаграфічнаму рэгіёну. Выбраць фотаальбомы, створаныя ў розныя гістарычныя перыяды. Адказаць на пытанні:

1. Бібліяграфічнае апісанне фотаальбома (абавязкова адзначыць прозвішчы аўтараў фота і тэксту).

2. Вызначыць віды фатаграфій ў альбоме (партрэты, пейзажазныя, відавыя).

3. На падставе двух-трох фотаздымкаў зрабіць высновы аб:

3.1. дакладнасці назвы фатаграфіі

3.2. наяўнасці тэкставага матэрыялу, які дапаўняе фотавыяву.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Заданне 3. Выявіць звесткі аб адным рэгіянальным фотамастаку (па выбары студэнта).***

1. Прывесці прозвішча, імя, даты жыцця ці перыяд творчасці.
2. Указаць рэгіён / населены пункт, з якімі звязана яго творчасць.
3. Выявіць жанры, у якіх працаваў фотамастак, адметныя рысы яго здымкаў.
4. Прывесці назвы і кароткія апісанні лепшых здымкаў.

***Заданне 4. Азнаёміцца з выданнем калекцыі аднаго са збіральнікаў краязнаўчых фотадакументаў ("Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej" Р.Афтаназі, А.Т.Федарука ("Старинные усадьбы Берестейщины", "Старинные усадьбы Минского края" ці інш.)***

1. Бібліяграфічнае апісанне выдання.
2. Вызначыць віды апублікаваных фатаграфій, рэгіёны, якім яны прысвечаны, тэматыку.
3. Ці суправаджае фатаграфіі тэкст?
4. Адзначыць наяўнасць паказальнікаў да выдання, карт, прыкніжныя спісы літаратуры.

***Заданне 5. Падрыхтаваць макет выставы фотадакументаў, прысвечаных абранаму рэгіёну. Макет павінен утрымліваць:***

1. Назву выставы, назвы раздзелаў выставы.
2. Умоўныя абазначэнні фотадакументаў, прадстаўленых у раздзелах.
3. Спіс бібліяграфічных апісанняў фотадакументаў.

**Літаратура**

Саітава, В.І. Фотадакументы як аб'ект краязнаўчай дзейнасці бібліятэк / В.І.Саітава // XI Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 24 – 26 мая 2006 г.): матэрыялы чытанняў. – Мн., 2006. – С.121 – 126.

Фотография: энцикл. справочник.- Мн., 1992. – С.37 – 39. Несцярчук, Л.М. Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X – XX стагоддзяў (гісторыя, стан, перспектывы) Л.М.Несцярчук. – Мн.: БЕЛТА, 2002. – 334 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ПРАКТЫЧНАЯ РАБОТА 5**

**Дзелавая гульня "Крыніцы інфармацыі па краязнаўству рэгіёна", 8 гадзін**

*Мэта: інфармаванне краязнаўцаў і насельніцтва аб краязнаўчых інфармацыйных рэсурсах рэгіёна.*

*Выкананне: практычная работа праводзіцца як дзелавая гульня.* Студэнты павінны паказаць уменні выяўляць і выкарыстоўваць інфармацыйныя рэсурсы розных відаў для інфармавання карыстальнікаў бібліятэк і насельніцтва.

Падрыхтоўка да дзелавой гульні пачынаецца з выбару рэгіёна (вобласці, горада, раёна), бібліятэкі (абласной, ЦБС, ВНУ і інш.), вывучэння інфармацыйнай сітуацыі. Мэтазгодна зыходзіць з недастатковага ведання групамі карыстальнікаў бібліятэкі або насельніцтвам інфармацыйных краязнаўчых рэсурсаў, асобных важных і цікавых крыніц, недахопу ўменняў па іх выкарыстанні.

*Для прыкладу: у якасці рэгіёна можа быць абрана Віцебская вобласць, бібліятэкі – Віцебская абласная бібліятэка, у якасці карыстальнікаў – настаўнікі школ, кіраўнікі пазашкольнай работы і іншыя спецыялісты, занятыя навучаннем і выхаваннем.*

Удзельнікі гульні выконваюць паралельна некалькі роляў, напрыклад, выступаюць як карыстальнікі з запытамі, прадстаўляюць чытацкую аўдыторыю і даводзяць канкрэтныя формы краязнаўчага бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання і папулярызацыі краязнаўчых ведаў. У склад форм, якія распрацоўваюцца для дзелавой гульні могуць уваходзіць выставы, бібліяграфічныя агляды, гутаркі, даклады, прэзентацыі, спісы літаратуры і іншыя бібліяграфічныя дапаможнікі і інш. Магчыма падрыхтаваць сцэнарый і правесці дзелавую гульню як дзень інфармацыі, дзень спецыяліста і інш. Абавязковым патрабаваннем з'яўляецца выкарыстанне розных відаў краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў (дакументных, бібліяграфічных і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фактаграфічных), друкаваных і электронных. Таксама неабходна комлексна адлюстраваць тэмы/галіны краязнаўства і спецыяльна прадставіць важнейшыя першасныя і другасныя крыніцы. Сярод першасных дакументаў абавязкова прадставіць прэзентацыі аднаго са зборнікаў рэгіянальных краязнаўчых канферэнцый і адной навуковай або навукова-папулярнай кнігі аб краі. Прэзентацыі рыхтуюцца ў праграме —Power Point”. Сярод другасных дакументаў у любой форме неабходна прадставіць бібліяграфічны паказальнік тыпу —новая літаратура аб вобласці”.

*Напрыклад, магчыма падрыхтаваць Дзень спецыяліста для настаўнікаў СШ Віцебскай вобласці ў дапамогу выкладанню факультатыўных краязнаўчых дысцыплін і уключэння мясцовага матэрыялу ў прадметы. Магчыма спецыялізаваць мерапрыемства, напрыклад, на гісторыі Віцебскай вобласці, гісторыі рэгіянальнага мастацтва і інш. У ліку бібліяграфічных крыніц прадставіць: паказальнік “Віцебская вобласць”, краязнаўчы электронны каталог АБ, БД “Прыдвінскі край”, краязнаўчыя сайты “vitebsk. net” і інш. Сярод дакументных крыніц магчыма прадставіць гербы, генеалагічныя звесткі, фотадакументы, тапанімічныя звесткі, падрыхтаваць прэзентацыі на зборнік канферэнцыі “Віцебшчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны” (2004), манаграфію А.М.Падліпскага “Евреи в Витебске” (2004) і інш.*

Структурныя элементы дзелавой гульні:

| Этапы дзелавой гульні | Мэты |
|---|---|
| Вытворчая нарада ў бібліятэцы | Выбар формы, размекаванне абавязкаў і зацвярджэнне графіку мерапрыемства |
| Падрыхтоўка сцэнарыю | Стварэнне цэласнай мадэлі мерапрыемства, выбар відаў краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў на аснове комплекснага падыходу |
| Авалодванне ролямі і функцыямі ўдзельнікаў гульні | Выступіць у якасці бібліятэкараў-бібліёграфаў краязнаўцаў, спецыялістаў |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| | краязнаўцаў. |
| Падрыхтоўка канкрэтных форм | Эфектыўна выкарыстаць методыку канкрэтнай формы |
| Правядзенне дзелавой гульні | Забяспечыць камфортнасць і якасць бібліятэчнага мерапрыемства |
| Падвядзенне вынікаў | Абгрунтаваць ацэнкі кожнага студэнта, ацэнку мерапрыемства |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## МЕТАДЫЧНЫЯ ЎКАЗАННІ ДЛЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Самастойная работа дапамагае арганізаваць раўнамернаю дзейнасць студэнтаў па вывучэнні прадмета, больш глыбока і грунтоўна засвоіць яго, дасягнуць своечасовага выканання заданняў, сачыць за індывідуальным рэйтынгам.

Асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на заданні, якія выконваюцца ў камп'ютарных класах і бібліятэках. Яны могуць мець індывідуальны характар і больш высокі ўзровень складанасці, што знойдзе адпаведнае адлюстраванне і ў сістэме ацэнак.

Глыбей засвоіць тэарэтычныя, арганізацыйныя і тэхналагічныя пытанні бібліятэчна-бібліяграфічнай краязнаўчай дзейнасці дапаможа і тэсціраванне. Рубежныя тэставыя кантролі змяшчаюць заданні match рознага ўзроўню складанасці і ахопліваюць заданні адкрытай і закрытай формаў, заданні на ўстанаўленне адпаведнасцей і правільнай паслядоўнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## САМАСТОЙНАЯ РАБОТА СТУДЭНТАЎ ПА КУРСУ

### Тэма 1. Інфармацыйныя краязнаўчыя рэсурсы: азначэнне функцыі, уласцівасці, структура. Класіфікацыя пісьмовых крыніц краязнаўства, 2 гадзіны.

**Форма кантролю – пісьмовае апытанне (лятучка).**

**Заданне і методыка падрыхтоўкі.** На падставе прапанаваных крыніц кожны студэнт рыхтуецца да адказаў на наступныя пытанні:

1. Якія групы крыніц па матэрыяльных носьбітах і знакавай прыродзе інфармацыі належаць да пісьмовых (тэкставых) крыніц?
2. Як класіфіцыруюцца друкаваныя крыніцы?
3. Якія дакументы адносяцца да крыніц актавага характару?
4. Якія дакументы адносяцца да крыніц літаратурнага характару?
5. Як праяўляецца ў пісьмовых крыніцах асоба іх стваральніка?

**Літаратура**

**Асноўная**

1. Мамонтов, А.В. Типы краеведческих источников и методы их изучения // Мамонтов А.В. Библиотечное краеведение; учеб. пособие. Вып. 1. Основы краеведения. – СПб, 1996. – С.14 – 22.
2. Ходзін, С.М. Крыніцы гісторыі Беларусі: (Гіст.-генетыч. і кампаратыўнае вывучэнне) / С.М.Ходзін; БДУ. – Мн.: БДУ, 1999. – С.3-5.

**Дадатковая:**

1. Несцяровіч, Ю.У. Праблема класіфікацыі археаграфічных публікацый і беларускія археаграфічныя выданні: (гісторыкаархеаграфічны нарыс) / Ю.У.Несцяровіч. – Мн.: БелНДІДАС, 1997. – 56 с.
2. Рыбакоў, А. Арганізацыя справаводства ў Вялікім княстве Літоўскім у канцы XV – XVII стст. / А.Рыбакоў // М.М.Улашчык і праблемы беларускай гістарыяграфіі, крыніцазнаўства і археграфіі (да 90-х угодкаў вучонага): Матэрыялы навук. канф. / БелНДІДАС; БДУ. Гіст. фак; Рэд.-склад. А.М.Гесь, В.У.Скалабан. – Мн., 1997. – С.237 – 249.

Тэма 2. **Афіцыйныя дакументы як крыніцы краязнаўчай інфармацыі, 2 гадзіны.**

**Форма кантролю – праверка тэстаў.**

**Заданне і методыка падрыхтоўкі.** Студэнты вывучаюць рэкамендаваную літаратуру, крыніцы, канспект лекцый, высвятляюць дакладныя адказы на пастаўленыя пытанні. Тэст праводзіцца ў вызначаны час.

**Пытанні:**

1. Каму належала права выдання законаў у перыяд уваходжання беларускіх зямель у склад ВКЛ?

1. Вялікаму князю (каралю) да_____
2. Сейму з_______

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Галоўнаму Літоўскаму трыбуналу

2. Канстытуцыі, лаўды, прывілеі, устаўныя граматы – гэта заканадаўчыя дакументы перыяду___________

3. Пералічыце тыпы грамат і прывілеяў:

1. ільготныя

2. даравальныя (ці жалаваныя)

3. ахоўныя (ці падцвяржальныя)

4. Пералічыце віды ільготных грамат і прывілеў:

1. земскія

2. абласныя

3. гарадам ці групам насельніцтва

4. канкрэтным асобам.

5. Назавіце некалькі беларускіх гарадоў, якія ў ліку першых атрымалі прывілей на Магдэбургскае права.

6. Патлумачце тэрмін канстытуцыя ў кантэксце заканадаўчай дзейнасці ў ВКЛ.

7. Пералічыце паказальнікі, змешчаныя ў выданнях Статута ВКЛ 1588 г. на польскай мове.

8. Складальнікам унутрыкніжных паказальнікаў у выданнях Статута ВКЛ 1588 г. на польскай мове быў:

1. С. Кажухоўскі

2. С.Канарскі

3. М.Ладоўскі

9. Назавіце найбольш поўнае выданне канстытуцый у XVIII ст.

10. ―Інвентары канстытуцый...” прызначаны для:

1. пошуку сеймавых канстытуцый па ―Volumina legum”

2. пошуку сеймавых канстытуцый па польскамоўных выданнях ―Статута ВКЛ 1588 года”

11. Укажыце перыяды развіцця заканадаўства, якое дзейнічала на тэрыторыі Беларусі ў перыяд уваходжання беларускіх зямель у Расійскую імперыю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

12. Права выдання законаў і заканадаўчай ініцыятывы ў Расійскай імперыі належала:

1. Імператару

2. Сенату

3. Сіноду

13. Пералічыце асноўныя віды заканадаўчых дакументаў перыяду Расійскай імперыі.

14. Растлумачце значэнне заканадаўчага дакумента паводле прыкладу:

1. імянныя ўказы – гэта распараджэнні імператара, якія накіроўваліся Сенату для выканання

2. абвешчаныя ўказы– гэта загады імператара, на аснове якіх Сенат ствараў тэксты ўказаў

3. сенацкія ўказы – ад імя Сената.

15. Назавіце тры асноўныя публікацыі законаў Расійскай імперыі.

16. Назавіце выданне, якое адлюстроўвае законы Расійскай імперыі з 1649 г. па 3 снежня 1825 г.

16. Якое з выданняў уключала дзеючыя і адмененыя заканадаўчыя дакументы?

17. Якія дапаможныя паказальнікі змешчаны ў ПСЗ?

18. Якія дапаможныя паказальнікі змешчаны ў выданнях бягучага заканадаўства?

19. ―Хронологический указатель указов и правительственных распоряжений по губерниям Западной России, Белоруссии и Малороссии за 240 лет, с 1652 по 1892" С.Ф.Рубинштейна дазваляе ўстанавіць размяшчэнні дакументаў:

1. ПСЗ

2.СЗ

3.СЗ і РП

20. Суаднясіце назвы органаў, у якіх публікаваліся заканадаўчыя дакументы, з гістарычнымі перыядамі:

1. ―Volumina legum"  А. Рэч Паспалітая Польская, 1921  - 1939 гг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. ―Собрание узаконений и распоряжений правительства, издаваемых при Правительствующем Сенате”  Б. Расія

3. ―Дзённік устаў Рэчы Паспалітай Польскай”  В. ВКЛ (Рэч Паспалітая)

**Крыніцы і літаратура**


1. Саітава В.І. Крыніцы бібліяграфічнай інфармацыі перыяду Рэчы Паспалітай абодвух народаў аб краях Беларусі / В.І.Саітава // Матэрыялы Другіх Кнігазнаўчых чытанняў ―Кніжная культура Рэчы Паспалітай” (Мінск, 15 – 16 верасня 2000 г.). – Мн., 2002. – С.8 – 31.
2. Ходзін, С.М. Крыніцы гісторыі Беларусі: (Гіст.-генетыч. і кампаратыўнае вывучэнне) / С.М.Ходзін; БДУ. – Мн.: БДУ, 1999. – С. 5-36.


Тэма 3. **Дакументныя рэсурсы справаводства і статыстыкі як крыніцы краязнаўчай інфармацыі. Выданні актавых дакументаў на сучасным этапе, 2 гадзіны.**

**Форма кантролю – праверка пісьмовых паведамленняў, гутаркі**

**Заданне і методыка падрыхтоўкі.** Кожны студэнт выбірае тры крыніцы для аналізу.Вывучаецца змест, прадмова, уводзіны, чытаюцца асобныя дакументы, каментары, паказальнікі да выданняў, тэрміналагічныя слоўнікі і інш.

**Крыніцы:**


1. Гродненская область в документах и материалах (1944 – 1995): 60-летию образования Гродн. обл. / Науч.-метод. учреждение «Гос. архив Гродн. обл.», Упр. делами Гродн. обл. исполн. ком. – Слоним: Слоним. тип., 2004. – 431 с.: ил., карты.
2. Беларускі кнігазбор. Адно з выданняў па выбару студэнтаў з падсерыі ―Гісторыка-літаратурныя помнікі”.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Восстание и война 1794 года в литовской провинции: (По документам российских архивов) / сост., ред. и предисл. Е.К.Анищенко. – М.: «Книжный дом «ЧеРо», 2000. – 176 с.
4. Восстание и война 1794 года в литовской провинции: (По документам архивов Москвы и Минска) / сост., ред. и предисл. Е.К.Анищенко. – Мн.: Общественное об-ние «Молодежное науч. об-во», 2001. – 210 с.
5. Стогн. Паўстанне і вайна 1794 года ў літоўскай правінцыі: дакументы / пад рэд. Я.Анішчанкі. – Мн.: Пейто, 2002. – 208 с.
6. Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кн. 43 (1523 – 1560). – Мн. : Бел. навука, 2003. – 167 с.
7. Перапіс войска Вялікага княства Літоўскага 1528 года. Кн. 523. – Мн.: 2003. – 445 с. (ці іншае выданне Метрыкі ВКЛ).

**Адказаць на пытанні:**

1. Бібліяграфічнае апісанне выдання.
2. Характарыстыка мэты выдання, актуальнасці сукупнасці адлюстраваных дакументаў. Якім карыстальнікам у якіх відах дзейнасці патрэбны даныя дакументы?
3. Якія віды дакументаў уключаны ў выданне, за які храналагічны перыяд?
4. Групоўка дакументаў, аптымізацыя пошукавых магчымасцей з дапамогай паказальнікаў да выданняў.
5. Прывесці 2-3 прыклады з кожнага выдання асобных фактаў, прысвечаных пэўным рэгіёнам.

Тэма 4. **Інфармацыйныя рэсурсы генеалогіі насельніцтва беларускіх рэгіёнаў, 6 гадзін**

**Форма кантролю – гутарка**

**Заданне і методыка падрыхтоўкі. Даць апісанне свайго радаводу.**

У пісьмовым выглядзе прывесці звесткі аб кожнай асобе Вашага роду: імя, імя па бацьку, прозвішча, дату і месца нараджэння. Адзначыць, з кім узяты шлюб (звесткі аб мужу, жонцы), прыводзіць дзявочыя прозвішчы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жанчын. Гарызантальнымі і вертыкальнымі стрэлкамі паказваюцца роднасныя сувязі.

Можа быць выкарыстана прыкладная форма:

Нашы дзеці

Я – муж

Мае бацькі Яго бацькі

Звесткі аб маіх бабулі і дзядулі Аб яго і г.д., наколькі вядома.

Указаць крыніцы звестак:

Вусныя (аповяды родных), пісьмовыя (пашпарты, і іншыя пасведчанні асоб, артыкулы з мясцовага друку, кніг гісторыка-дакументальных хронік ―Памяць" і г.д.)

Тэма 5. **Інфармацыйныя рэсурсы па геральдыцы беларускіх рэгіёнаў і населеных пунктаў, 6 гадзін.**

**Форма кантролю – праверка пісьмовай працы, гутаркі**

**Заданне 1. Даць апісанне мясцовага герба.**

Аб'ектам апісання можа быць герб горада, раёна, вобласці, выбраны па жаданні студэнтаў.

1. Прывесці гістарычныя звесткі аб узнікненні герба.
2. Час зацвярджэння сучаснага герба, яго апісанне. Патлумачыць функцыі элементаў гербавай выявы, прымененую каларыстыку. Па магчымасці, назваць стваральнікаў герба. Адзначыць, як выкарыстоўваецца герб.

**Заданне 2. Распрацаваць мерапрыемства** для правядзення ў бібліятэцы для папулярызацыі герба.

Літаратура


1. Памяць: гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. Выбіраюцца кнігі адпаведнага рэгіёну.
2. Рассадзін, С.Я. Гербы і сцягі гарадоў і раёнаў Беларусі / С.Я.Рассадзін, А.М.Міхальчанка. – Мн.: Беларусь, 2005. – 128 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Цітоў, А.К.Геральдыка беларускіх местаў / А.К.Цітоў. – Мн: Полымя, 1998. – 287 с.

Тэма 6. **Інфармацыйныя рэсурсы па тапаніміцы рэгіёнаў Беларусі, 6 гадзін**

**Форма кантролю – праверка пісьмовай працы, гутаркі**

**Заданне 1.** Пазнаёміцца з выданнямі ―Слоўнікаў назваў населеных пунктаў...” абласцей Беларусі Я.Н.Рапановіча і ―Даведнікамі назваў населеных пунктаў абласцей Беларусі” НАН Беларусі, прааналізаваць адзін са слоўнікаў кожнага выдання:

1.Даць характарыстыку мэты і метадычных асаблівасцей слоўніка ў цэлым.

2.Якія групы крыніц выкарыстоўваліся пры яго ўкладанні? Ці ёсць у слоўніку спіс літаратуры, бібліяграфічныя спасылкі?

3. Якія звесткі аб населеных пунктах прыводзіць аўтар?

4. У якім парадку згрупаваны звесткі ў слоўніку ў цэлым і ў рубрыках. Прывесці 2-3 прыклады перайменаваных населеных пунктаў. Вашы асабістыя меркаванні ад параўнання старой і новай назваў.

5. Вызначыць гады (перыяды), калі масава адбываліся перайменаванні (1-2 прыклады).

**Заданне 2.** Даць агульную характарыстыку раздзела, прысвечанага мясцовай тапаніміцы, у адной з кніг серыі ―Памяць”.

**Заданне 3.** Пазнаёміцца з адным навуковым (навукова-папулярным) выданнем (артыкулам), прысвечаным тапаніміцы.

1. Даць агульны бібліяграфічны аналіз публікацыі.

2. Ахарактарызаваць выкарыстанне аўтарам бібліяграфічнай інфармацыі:

2.1 Кола выкарыстаных крыніц па відах выданняў, відаў літаратуры па мэтаваму прызначэнню, тэрытарыяльнай, храналагічнай і моўнай прыкметах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2.2 Наяўнасць бібліяграфічных спасылак, цытавання, аглядаў літаратуры па тэме, спісаў выкарыстанай літаратуры і інш.

2.3. Прачытаць адзін з раздзелаў кнігі, падрыхтаваць рэферат.

**Заданне 4.** Прачытаць на выбар 2-3 легенды, паданні аб паходжанні мясцовых назваў. Па-магчымасці супаставіць з навукова абгрунтавамі тлумачэннямі паходжання тых жа назваў.

*Для падрыхтоўкі адказаў выкарыстоўваецца выданні з фонду 316 каб., бібліятэкі універсітэта, ЦБ НАН Беларусі і НББ.*

Тэма 7**. ―Інфармацыйныя рэсурсы па дыялектах і гаворках беларускай мовы"**, 10 гадзін

**Форма кантролю – праверка пісьмовай працы, гутаркі.**

*Мэта:* пазнаёміцца з крыніцамі інфармацыі аб рэгіянальных асаблівасцях беларускай мовы: дыялеклагічнымі слоўнікамі, атласамі, навуковай, навукова-папалярнай і мастацкай літаратурай.

*Выкананне*: правесці выяўленне крыніц, адказаць на прапанаваныя пытанні:

***Заданне 1. Даць характарыстыку 5-ці дыялекталагічных слоўнікаў.***

1. Від слоўніка.
2. На які перыяд часу адлюстраваны слоўны матэрыял і ў межах якога рэгіёну.
3. Пералічыць элементы дадзеных (словы, выразы, тлумачэнні ўжывання, прыклады з літаратурных твораў, склоны і інш.).
4. Прывесці некалькі прыкладаў слоў.

***Заданне 2. Сабраць некалькі мясцовых слоў і выразаў (да 5).***

.

1. Дакладна перадаць іх гучанне (захаваць асаблівасці вымаўлення і націску), прывесці прыклады ўжывання.
2. Па-магчымасці параўнаць з існуючымі дыялеклагічнымі слоўнікамі (ці прадстаўлены ў іх даныя словы, ці захавалі сваё

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сэнсавае значэнне), патлумачыць паходжанне гэтых слоў і выразаў.

***Заданне 3. Навуковая і навукова-папулярная літаратура.***

1. Па бібліяграфічных дапаможніках: ―Беларуская мова, літаратура, мастацтва", ―Новая літаратура аб вобласці" і іншых бягучых і рэтраспектыўных паказальніках выявіць рубрыкі і раздзелы, дзе прадстаўлены навуковыя і навукова-папулярныя публікацыі аб рэгіянальных асаблівасцях беларускай мовы, запісаць гэтыя звесткі ў сшытак. Выявіць артыкулы, кнігі аб моўных асаблівасцях пэўнага рэгіёну на выбар.

2) Падрыхтаваць рэферат па абранай тэме.

***Заданне 4. Літаратурна-мастацкія творы.***

Выявіць мастацкія творы з краязнаўчым аспектам зместу. Адзначыць рэгіён, ў межах якога развіваецца сюжэт твора. Выявіць некалькі мясцовых слоў і выразаў, ужытых пісьменнікам, паказаць іх значэнне для стварэння мастацкага каларыту твора і адлюстравання ў ім ―рэгіянальнай адметнасці".

**Крыніцы**

Каталогі НББ, ЦБ НАН і іншых бібліятэк.

Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак / Інстытут мовазнаўства імя Я.Коласа. – Мн., 1968 – 318 с.

Тэма 8. **Фотадакументы як крыніцы краязнаўчай інфармацыі, 4 гадзіны**

**Форма кантролю – праверка пісьмовых прац, гутаркі**

***Заданне 1. Выявіць звесткі аб адным мясцовым фотамастаку (па выбары студэнта).***

1. Прывесці прозвішча, імя, даты жыцця ці перыяд творчасці.
2. Указаць рэгіён / населены пункт, з якімі звязана яго творчасць.
3. Выявіць жанры, у якіх працаваў фотамастак, адметныя рысы яго здымкаў.
4. Прывесці назвы і кароткія апісанні лепшых здымкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Заданне 2. Падрыхтаваць макет выставы фотадакументаў, прысвечаных абранаму рэгіёну. Макет павінен утрымліваць:***

1. Назву выставы, назвы раздзелаў выставы.
2. Умоўныя абазначэнні фотадакументаў, прадстаўленых у раздзелах.
3. Спіс бібліяграфічных апісанняў фотадакументаў.

**Крыніцы**

Каталогі НББ, ЦБ НАН і іншых бібліятэк, бягучыя дзяржаўныя паказальнікі, галіновыя бягучыя і рэтраспектыўныя дапаможнікі.

Тэма 9. **Краязнаўчая інфармацыя ў мемуарнай літаратуры, 14 гадзін**

**Форма кантролю – праверка пісьмовай працы, гутаркі**

*Мэта:* пазнаёміцца з крыніцамі мемуарнай літаратуры.

*Выкананне*: правесці выяўленне мемуарнай літаратуры, яе агульны бібліяграфічны аналіз, вывучэнне. Падрыхтаваць бібліяграфічныя агляды.

Для выяўлення мемуарнай літаратуры выкарыстоўваюцца універсальныя краязнаўчыя паказальнікі ―Новая літаратура аб вобласці”, паказальнікі бягучай нацыянальнай бібліяграфіі, паказальнікі” Беларуская мова, літаратура, мастацтва” і іншыя бібліяграфічныя крыніцы. Можна выкарыстаць мемуарныя творы, прыведзеныя ў спісе. Кожны студэнт робіць агульны бібліяграфічны аналіз і чытае 2 творы мемуарнай літаратуры за розныя гістарычныя перыяды, прысвечаныя асобным рэгіёнам Беларусі. Аб кожным творы неабходна падаць наступныя звесткі:

1. Бібліяграфічнае апісанне публікацыі.
2. Звесткі аб гістарычным перыядзе з сучасных даведачных і навуковых крыніц.
3. Звесткі аб асобе мемуарыста, ўзятыя з навукова-даведачнага апарату мемуараў, ці з іншых крыніц. Як прадстаўлена асоба мемуарыста ў творы, яго разважанні, думкі, пачуцці, ацэнкі і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Рэфератыўная анатацыя на мемуарны твор, з вызначэннем рэгіёна (населенага пункта), часу, падзей.
5. Значэнне навукова-даведачнага апарату (прадмоў, уступных артыкулаў, каментароў, слоўнікаў і інш.)
6. Ілюстрацыйнае афармленне мемуарнага твора.

**Спіс выданняў мемуараў (з шыфрамі ЦБ НАН)**

***XVI – XVIII стст.***

<u>ОБ-ХХ</u>

Нр5926 Герберштейн, С. Записки о Московии. – М., 1988.

<u>ОБ-ХХ</u>

Нр 1335 Дневник генерального хоружего Николая Ханенка 1727 – 1753. – Киев, 1884. – 524 с.

<u>ОБ-ХХ</u>

Нр 7885 Дневники Марины Мнишек. – Спб., 1995. – 199 с.

Запіскі і дыярыуш Яна Уладзіслава Пачобута-Адланіцкага / пер. з пол., прадм. і камент. В.У.Таранеўскага // Полымя. – 2001. - №10. – С.195 – 246. (Пісьменнік, вайсковец, аб грамадскім і сямейным жыцці ў 1668 – 1684 гг.)

<u>Б-ХХ</u>

Нр 6603 Патоцкі, Л. Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану / Л.Патоцкі – Мн. : Полымя, 1997. – 268 с.

Свяжынскі, У.М. ―Гістарычныя запіскі" Ф.Еўлашоўскага / У.М. Свяжынскі. – Мн., 1990.

Успаміны Яна Цадроўскага / падрыхт. да публ. А.Ф.Коршунаў // Беларуская літаратура. – Вып. 5. – Мн., 1977. – С.154 – 167.

Сагановіч, Г. Нямецкі падарожнік Самуэль Кіхэль пра Гародню часоў Стэфана Баторыя / Г.Сагановіч // Спадчына. – 2002. - № 2/3. – С.66 – 70.

***XIX – пачатак XX ст.***

Булгак, Я. Край дзіцячых гадоў / Я.Булгак. – Мн.: Беларусь, 2004. – 415 с.

Булгарин, Ф. Воспоминания // Неман. – 1995. - № 10/11. – С.170 – 227.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Насович, И.И. Воспоминания моей жизни / предисл. Н.Гилевича; подгот. текста к печата и публ. Т.М.Судник и др.; послесл. к публ. Т.Судник / И.И.Носович // Неман. – 1997. - № 2. – С.175 – 243; № 3. – С.179 – 239; № 4. – С.194 – 255.

Никифоровский, Н.Я. Странички из недавней старины города Витебска: воспоминания сторожила / предисл., текстол. подгот. и коммент. А.М.Подлипского / Н.Я. Никифоровский. – Мн. : Полымя, 1995. – 149 с.

Сыракомля, У. Падарожжа па маіх былых ваколіцах / У.Сыракомля

***Заходняя Беларусь (1921 – 1939)***

Гарашкевіч, Р. Столінскі павет: гіст. нататкі /Раман Гарашкевіч; прадм. і пер з пол. мовы Аляксандра Вабішчэвіча // Спадчына. – 2002. – №2/3. – С.159 – 173.

Драздовіч, Я. Дзённік / уступ. арт. ―Таямнічасць і рэальнасць у жыцці Язэпа Драздовіча” (№ 5, с.115 – 116). Л.Збралевіч, Я.Кісялёвай // Маладосць. – 1991. - № 5. – С.117 – 123; № 6. – С.101 – 107; № 7. – С.111 – 124; № 8. – С.103 – 123; №9. – С.127 – 134; - №10. – С.113 – 130; № 11. – С.101 – 112.

***БССР***

Данілюк, Т. Мае ўспаміны аб службе ў беларускіх вайсковых фармацыях і ўдзеле ў беларускім збройным змаганьні 1917 – 1921 гг. / Т.Данілюк // Спадчына. – 1995. - № 5. – С.19 – 31. (Слуцкі збройны чын).

Мельнікаў, М. Адчай, боль і горыч: успаміны / Мікола Мельнікаў . – Гродна, 2005.

***Мемуары эмігрантаў***

Юрэвіч, Л. Мемуары на эміграцыі: крыніцазн. даслед. / Л.Юрэвіч. – Мн.: Бел. кнігазбор, 2005. – С.103 – 108. Выбраць успаміны па жаданні з сістэматызаванага спіса (974 назвы публікацый).

Тэма 10. **Рэгіёны ў літаратурна-мастацкіх і публіцыстычных творах, 12 гадзін**

**Форма кантролю – праверка аглядаў літаратуры, гутаркі**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пазнаёміцца з творчасцю пісьменнікі, які ўвасабіў адметнасці пэўнага краю. Прачытаць яго творы, біяграфічную і крытычную літаратуру. Падрыхтаваць бібліяграфічны агляд па тэме ―Край у творчасці …”.

**Літаратура**

**Асноўная**


1. Крывашэй, Дз. Літаратурныя мясціны Беларусі: краязнаўчы даведнік / Дз. Крывашэй, Л.Кулажанка, А.Мальдзіс, С.Сачанка // Маладосць. – 2007. – № 5. – 2008. - № 10.
2. Кулажэнка, Л. Літаратурнае краязнаўства: дапаможнік для настаўнікаў / Л.Кулажэнка. – Мінск, 2004. – 324 с.


**Дадатковая**


3. Лиокумович, Т.Б. Потомки А.С.Пушкина в Беларуси / Т.Б.Лиокумович. – Минск: Універсітэцкае, 1999. – 166 с.
4. Шаркоўшчынскаму краю: зборнік паэзіі / Т.Еўдакова, М.Кукуць, Л.Лабачэўская і інш. – Мн: МГА ―Бел. кнігазбор”, 2002. – 127 с.: фат.


Тэма 11. **Рэгіёны ў творах выяўленчага і музычнага мастацтва, 8 гадзін**

**Форма кантролю – праверка падрыхтаваных матэрыялаў, гутаркі**

Пазнаёміцца з творчасцю мастака ці музыканта, які ўвасабіў адметнасці пэўнага краю. Выявіць і вывучыць біяграфічную і мастацтвазнаўчую літаратуру. Падрыхтаваць электронную прэзентыю ці малую форму рэкамендацыйнага бібліяграфічнага дапаможніка (па жаданні студэнта) па тэме ―Край у творах мастака/музыканта”.

Тэма 12. **Краязнаўчая інфармацыя ў перыядычных і прадаўжальных выданнях, 12гадзін**

**Форма кантролю – праверка пісьмовай працы, гутаркі**

**Заданне.** Падрыхтаваць агляд матэрыялаў з аднаго (па выбару студэнтаў) краязнаўчага перыядычнага выдання. Краязнаўчыя выданні выяўляюцца па паказальніку ―Летапіс перыядычных выданняў…” НКП,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каталогах НББ, ЦБ НАН і іншых бібліятэк. У аглядзе звярнуць увагу на выдаючую арганізацыю, перыядычнасць, тыраж, від выдання, наяўнасць стабільных рубрык, кола аўтараў. Выбар артыкулаў і іншых матэрыялаў павінен паказаць галоўныя кірункі даследаванняў края, адметныя мясціны і выдатных асоб.

## Тэма 13. Краязнаўчыя каталогі, картатэкі, базы даных, бібліяграфічныя дапаможнікі, 10 гадзін

**Форма кантролю – праверка матэрыялаў, гутаркі**

**Заданне.** Прааналізаваць аб’ём і змест асноўных тэрміналагічных паняццяў тэмы на аснове іх вывучэння па выданнях: –Библиотечная энциклопедия” (М., 2007), –Справочник библиотекаря”, –Справочник библиографа” (навейшыя выданні), СТБ ГОСТ 7.0-2004. Інфармацыйна-бібліятэчная дзейнасць, бібліяграфія. Тэрміны і азначэнні = Информационно-библиотечная деятельность, библиография. Термины и определения. – Узамен ГОСТ 7.0–84, ГОСТ 7. 26–80; уведз. 2005 -03 -01. – Мн., [2004]. – 35 с. Пры супадзенні азначэнняў, яны не дубліруюцца.

Матэрыял аформіць ў таблічнай форме:

| Тэрмін | –Библиотечная энциклопедия” | –Справочник библиотекаря” | –Справочник библиографа” | СТБ ГОСТ 7.0-2004 | вывад |
|---|---|---|---|---|---|
| Краязнаўчы каталог | | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ГРАФІК КАНТРОЛЮ ЗА САМАСТОЙНАЙ РАБОТАЙ СТУДЭНТАЎ па курсу “Інфармацыйныя рэсурсы краязнаўства“

| № п\п | Тэмы для кантролю па СРС | Форма кантролю, тэрмін | Знаходжанне метадычных матэрыялаў | Тэрмін кантролю | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | № тыдня | месяц |
| 1 | Дакументныя рэсурсы па генеалогіі насельніцтва беларускіх рэгіёнаў | Гутаркі. | Вучэбна-метадычны комплекс, 312 каб. | 11 | Лістапад |
| 2 | Дакументныя рэсурсы па геральдыцы беларускіх рэгіёнаў і населеных пунктаў | Праверка пісьмовай працы, гутаркі. | Там жа | 12 | Лістапад |
| 3 | Дакументныя рэсурсы па тапаніміцы рэгіёнаў Беларусі | Праверка пісьмовай працы, гутаркі, выступленні на семінары. | Там жа | 13 | Лістапад |
| 4 | Дакументныя рэсурсы па дыялектах і гаворках беларускай мовы | Праверка пісьмовай працы, гутаркі. | Там жа | 14 | Снежань |
| 5 | Краязнаўчая інфармацыя ў мемуарнай літаратуры | Праверка пісьмовай працы, гутаркі, выступленні на семінары. | Там жа | 15 | Снежань |
| 6 | Краязнаўчыя перыядычныя выданні | Праверка пісьмовай працы, гутаркі. | Там жа | 16 | Снежань |
| 7 | Карткавыя, друкаваныя і электронныя формы бібліяграфічных рэсурсаў па краязнаўстве | Праверка матэрыялаў, гутаркі | Там жа | 17 | Снежань |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэсты для самаправеркі студэнтаў

*Варыянт 1.*

1) У чым заключаецца значнасць заканадаўчых дакументаў мінулага для гісторыка-краязнаўчых даследаванняў?

2) Хто меў права выдання законаў у ВКЛ да 16 ст.?

*Варыянт 2.*

1) Прадоўжыце лагічны рад: boni ordinus, пасольскія, ___________________ ?

2) Ці з'яўлялася законам у часы Расійскай імперыі распараджэнне імператара ―быць посему"?

*Варыянт 3.*

1) Які ўказ называўся абвешчаным у часы Расійскай імперыі?

2) Як называецца найбольш поўнае выданне канстытуцый вальных сеймаў ВКЛ і Рэчы Паспалітай абодвух народаў?

*Варыянт 4.*

1) Колькі разоў выходзіла ―Полное собрание законов Российской империи" (ПСЗ)?

2) Чаму няма чоткай класіфікацыі заканадаўства перыядуРасійскай імперыі?

*Варыянт 5.*

1) Каму належала заканадаўчая ўлада ў ВКЛ пасля 1588 г.?

2) ―Полное собрание законов Российской империи" уключае як дзеючыя заканадаўчыя акты на момант яго выдання, так і ___________________

*Варыянт 6.*

1) Прадоўжыце лагічны рад: сенацкія, абвешчаныя, ___________________ ?

2) Хто склаў ―рэгістры" для польскамоўных выданняў Статуту ВКЛ?

*Варыянт 7.*

1) ―Інвентары канстытуцый..." прызначаны для ______________ .

З якіх рубрык яны утвораны?

2) Якія з выданняў былі зводамі бягучага заканадаўства ў Расійскай імперыі?

   1) ―Полное собрание законов Российской империи" (ПСЗ).

   2) ―Свод законов Российской империи" (СЗ)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3) “Собрание узаконений и распоряжений правительства, издаваемых при Правительствующем Сенате” (СУ и РП).

*Варыянт 8.*

1) Што такое лаўда?
2) Па якому прынцыпу быў пабудаваны “Свод законов” (СЗ) у Расійскай імперыі?

*Варыянт 9.*

1) На якія тыпы падзяляюцца устаўныя граматы і прывілеі ВКЛ па тыпах?
2) Якое значэнне мела паняцце “канстытуцыя” у ВКЛ?

*Варыянт 10.*

1) На якія віды падзяляюцца устаўныя граматы і прывілеі ў ВКЛ?
2) Якія паказальнікі ўвайшлі ў асобныя тамы “Полного собрания законов Российской империи”?

**Рэйтынгавы рэгламент**

па курсу “Інфармацыйныя рэсурсы краязнаўства”, раздзелы III –IV

| Наведванне лекцый | Адказ на сем. | Практ. | Формы СРС | Усяго мах. | 70% допуск да экз. |
|---|---|---|---|---|---|
| 2*12=**24** | 4*10=**40** | 16*10=**160** | 7тэм*10=**70** | **294** | **205,8** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ЛІТАРАТУРА**

*Асноўная*

8. Бирюкович, К.А.Мемуаристика: ее место и роль в краеведении / К.А.Бирюкович // Библиография. – 2003. – № 2 . – С.13 – 16.
9. Грядовкина, И. В. Памятные книжки Витебской губернии в системе источников по истории Беларуси второй половины XIX — начала XX в. / Грядовкина И. В. // Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі / Нацыянальная бібліятэка Беларусі. – Мінск, 2011. — Вып. 13 / [складальнікі: Л. Г. Кірухіна, К. В. Суша; рэдкалегія: Р. С. Матульскі (галоўны рэдактар) і інш.] — С. 127—140. — Библиография: 11 назв.
10. Мамонтов, А.В. Типы краеведческих источников и методы их изучения // Мамонтов А.В. Библиотечное краеведение; учеб. пособие. Вып. 1. Основы краеведения. – СПб, 1996. – С.14 – 22.
11. Мянжынскі, В.С. Матэрыялы з Метрыкі Вялікага княства Літоўскага, апублікаваныя М.Ф.Спірыдонавым у серыі кніг ―Памяць" – гісторыка-дакментальных хронік гарадоў і раёнаў Беларусі / В.С.Мянжынскі // Памяць стагоддзяў на карце Айчыны: зборнік навуч. прац у гонар 70-годдзя М.Ф.Спірыдонава. – Мінск, 2007. – С.389 – 396.
12. Несцяровіч, Ю.У. Праблемы класіфікацыі археаграфічных публікацый і беларускія археаграфічныя выданні: (Гісторыка- археагр. нарыс). – Мн.: БелНДІДАС, 1997. – 56 с.
13. Рассадзін, С.Я. Гербы і сцягі гарадоў і раёнаў Беларусі / С.Я. Рассадзін, А.М.Міхальчанка. – Мн.: Беларусь, 2005. – 127 с.
14. Рыбчонак, С.А. Класіфікацыя крыніц па генеалогіі / С.А.Рыбчонак // Гістарычныя крыніцы. – Мн., 2001.– С.43 – 45.
15. Саітава, В.І. Гісторыя краязнаўства Беларусі : вучэбны дапаможнік / В.І.Саітава. – Мінск : Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, 2009. – 205 с.
16. Саітава, В.І. Крыніцы бібліяграфічнай інфармацыі перыяду Рэчы Паспалітай абодвух народаў аб краях Беларусі / В.І.Саітава // Матэрыялы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Другіх Кнігазнаўчых чытанняў —Кніжная культура Рэчы Паспалітай" (Мінск, 15 – 16 верасня 2000 г.). – Мн., 2002. – С.8 – 31.
17. Саітава, В.І. Публікацыі грамадскіх краязнаўчых арганізацый як прадстаўленне рэгіянальнай адметнасці ва ўмовах глабалізацыі культуры / В.І.саітава // Бібліятэчны веснік : зборнік артыкулаў / Нацыянальная бібліятэка Беларусі. – Мінск, 2010. – Вып. 1. – С.71–77.
18. Улашчык, М. Мемуары і дзённікі як крыніцы па гісторыі Беларусі: З рукап. спадчыны / М.Улашчык; Уклад.: Я.М.Кісялёва, В.У.Скалабан. – Мн.: Пейто, 2000. – 86 с.
19. Улащик, М. Очерки по археографии и источниковедению истории Беларуси феодального периода / М.Улащик. - М.:Наука, 1973. – 276 с.
20. Цітоў, А.К.Геральдыка беларускіх местаў / А.К.Цітоў. – Мн: Полымя, 1998. – 287 с.
21. Ходзін, С.М. Крыніцы гісторыі Беларусі: (Гіст.-генет. і кампаратыўнае вывучэнне) / С.М.Ходзін. – Мн.: БДУ, 1999. – 192 с.
22. Шур, В. З гісторыі ўласных імёнаў / В.Шур. – Мн: Выш. шк., 1993. – 156 с.

*Дадатковая*

1. Адамушко, У.І. Геральдычны вянок Віцебшчыны / У.І. Адамушка, М.М.Елінская, С.В.Рублеўскі. – Віцебск : Віцебская абласная друкарня, 2010. – 94 с.
2. Баранава, Ю.А. Генеалогія беларускага шляхецка-дваранскага саслоўя: гісторыяграфічны агляд / Ю.А.Баранава // Труды молодых специалистов Полоцкого государственного университета. – Полоцк, 2007. – Вып. 20. Гуманитарные науки. – С.77 – 83.
3. Витебщина архивная в начале XXI века: связь времен. – Витебск: Витеб. обл. типография, 2008. – 191 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Дубовік, В.І. Раённая газета: гісторыя і практыка / В.І.Дубовік // Весн. БДУ. Сер.4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. - 2002. - № 2. – С.82 – 86.
5. Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. Вып.1. / Рэдкал.: С.М.Ходзін (адказ. Рэд.) і інш. – Мн.:БДУ, 2002. – 254 с.
6. Мальдзіс, А.В. Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі / А.В.Мальдзіс. – Мн.: ТАА ―Лімарыус”, 2001. – 383 с.
7. Лыч, Л.М. Назвы зямлі беларускай / Л.М.Лыч. – Мн.: Універсітэцкае, 1994. – 128 с.
8. Рогалев, Л.Ф. Этнотопонимия Беларуси (на фоне этничной истории) / Л.Ф.Рогалев. – Гомель, 1993. – 167 с.
9. Рыбчонак, С.А. Крыніцы па генеалогіі Беларусі XVI – пачатку XX ст: метад. парады / С.А.Рыбчонак. – Мінск: БелНДІДАС, 2003. – 74 с.
10. Саітава, В.І. Бібліяграфічнае адлюстраванне гісторыі Брэсцкага краю ў часопісе ―Ateneum wileńskie / В.І. Саітава // Берасцейскія кнігазборы : Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі ―Берасцейскія кнігазборы : праблемы і перспектывы даследавання” (Брэст, 30 – 31 кастрычніка 2008 г.) / УК ―Абласная бібліятэка імя М. Горкага” ; складальнікі А.М.Мяснянкіна, Т.С.Кавенька. – Брэст, 2010. – С.160–167.
11. Саітава, В.І. Крыніцы бібліяграфічнай інфармацыі перыяду Рэчы Паспалітай абодвух народаў аб краях Беларусі / В.І.Саітава // Матэрыялы Другіх Кнігазнаўчых чытанняў ―Кніжная культура Рэчы Паспалітай” (Мінск, 15 – 16 верасня 2000 г.). – Мінск, 2002. – С.8–31.
12. Саўчанка, Н. ―Гісторыя беларускай фатаграфіі” – асноўныя напрамкі, вынікі і перспектывы даследавання / Н. Саўчанка // Музейн. Весн. – 2003. – Вып. 1. – С.55 – 58.
13. Улашчык, М. Працы па археаграфіі і крыніцазнаўству гісторыі Беларусі: З рукапіснай спадчыны / М. Улашчык; Уклад.: Я.М.Кісялёва, В.У.Скалабан. – Мн.: БелНДІДАС, 1999. – 114 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Загадчык кафедры
тэорыі і гісторыі ІДК
____________ Касап В.А.

____ __________ 2015 г.

**Пералік тэарэтычных пытанняў** да заліку па вучэбнай дысцыпліне
–Інфармацыйныя рэсурсы краязнаўства.
Раздзел ІІІ. Асобныя калекцыі дакументных рэсурсаў па краязнаўстве
Раздзел ІV. Бібліяграфічныя рэсурсы бібліятэкі па краязнаўстве”

1. Асноўныя паняцці геральдыкі. Віды гербаў. Значэнне геральдыкі ў краязнаўчай рабоце бібліятэк.
2. Асаблівасці гербаў беларускіх тэрыторый у асобныя гістарычныя перыяды. Геральдычная дзейнасць у Беларусі на сучасным этапе.
3. Агульная характарыстыка інфармацыйных рэсурсаў геральдыкі.
4. Інфармацыя аб беларускіх рэгіёнах і населеных пунктах у гербоўніках.
5. Асноўныя паняцці генеалогіі. Дзейнасць па генеалогіі ў Беларусі на сучасным этапе. Значэнне генеалагічнай інфармацыіў краязнаўчай рабоце бібліятэк.
6. Характарыстыка інфармацыйных рэсурсаў генеалогіі. Генеалагічная інфармацыя ў гербоўніках.
7. Рэгіянальныя гербоўнікі беларускай шляхты.
8. Агульная характарыстыка анамастыка і тапанімікі. Значэнне тапанімічнай інфармацыі ў краязнаўчай рабоце бібліятэк.
9. Асноўныя тыпы населеных пунктаў у Беларусі. Змены назваў і іх вынікі.
10. Характарыстыка інфармацыйных рэсурсаў па тапаніміцы беларускіх рэгіёнаў.
11. Рэгіянальныя тапанімічныя слоўнікі: агульная характарыстыка.
12. Асноўныя дыялекты і гаворкі беларускай мовы. Значэнне вывучэння рэгіянальных асаблівасцей мовы ў краязнаўчай рабоце бібліятэк.
13. Характарыстыка інфармацыйных рэсурсаў па дыялектах і гаворках беларускай мовы. Дыялекталагічныя слоўнікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

14. Агульная характарыстыка мемуарыстыкі. Значэнне мемуараў як крыніц інфармацыі ў краязнаўчай дзейнасці бібліятэк
15. Этапы развіцця рэгіянальнай мемуарыстыкі на Беларусі.
16. Адлюстраванне беларускіх тэрыторый у мемуарыстыцы XVI – XVIII стст.
17. Адлюстраванне беларускіх тэрыторый у мемуарыстыцы XIX ст. да сучаснага часу.
18. Перыядычныя выданні XIX - пачатку XX ст. як крыніца краязнаўчай інфармацыі.
19. Краязнаўчая перыёдыка ў БССР і ў Беларусі на сучасным этапе.
20. Краязнаўчая перыёдыка ў Заходняй Беларусі ў 1921 – 1939 гг.
21. Беларускія летапісы і хронікі як крыніцы краязнаўчай інфармацыі.

Выкладчык
_______________І.М.Стрыжонак

Разгледжаны на пасяджэнні
кафедры
тэорыі і гісторыі ІДК
пратакол № 2 ад 23.09.2015г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ